Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 КРАСАВІКА 2016 г. АЎТОРАК № 72 (28182) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Звязда» спяшаецца на дапамогу

СТАР. 7



Біткойн – грошы будучыні?

СТАР. 8



Загадкі Зялёнага кантынента

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта:**

*«Стварэнне новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, у тым ліку прыватных, — адна з галоўных нашых задач. У 2015 годзе ў гарадах і раёнах вобласці былі адкрыты 171 новае прадпрыемства і вытворчасць, створана 1 тыс. 771 працоўнае месца. На тэрыторыі вобласці налічваецца 33 тыс. суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, у прадпрымальніцкім сектары занята каля 25% ад агульнай колькасці працуючых у эканоміцы вобласці. Чвэрць займаецца гандлем, пятая частка занятая ў прамысловасці, столькі ж у сельскай гаспадарцы. Для нас сёння актуальныя праекты ў сферы перапрацоўкі мяса, малака, рапсу, лёну, торфу, драўніны, выпуску шырокай гамы будаўнічых матэрыялаў. Гэта значыць, вырабляць варта тое, што грунтуецца на мясцовай сыравіне».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 20213,00 | ▲ |
| Еўра | 22837,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 295,30 | ▼ |
| Укр. грыўня | 793,44 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Захаваць карані



Фота Надзеі БУЖАН.

Галоўнай «фішкай» незвычайнага суботніка, які адбыўся ў прысталічным жылым раёне Новая Баравая, стала перасадка 25-гадовага дуба за межы будаўнічай пляцоўкі новага дома. Гэта адбылося дзякуючы спецыяльнай машыне, якая дазваляе выкопваць і перасаджваць вялікія дрэвы. З дапамогай такой тэхнікі дрэва застаецца ў зямлі, у якой яно расло доўгія гады. Важна, што ў такім выпадку захоўваецца неабходная каранёвая сістэма, якая дапамагае дрэву прыжыцца на новым месцы. Арганізатарам акцыі выступіла кампанія «А-100», супрацоўнікі якой прынялі непасрэдны ўдзел у «зялёным» суботніку.

# НА ІХ ГЛЯДЗЕЛА ЎСЯ КРАІНА

## Беларускія тэнісісткі прабіліся ў Сусветную групу Кубка Федэрацый

**Барацьба з расіянкамі яшчэ да пачатку паядынкаў абяцала быць цяжкай. Па-першае, зборная Расіі ў рэйтынгу FedCup знаходзіцца значна вышэй за нашу каманду, па-другое, саперніцы беларускіх дзяўчат выбралі грунтавое пакрыццё, яно, як вядома, мяккае і павольнае, што магло прынесці дадатковую нязручнасць беларускам. Да таго ж, удзел у матчы лідара нашай зборнай Вікторыі Азаранкі быў пад пытаннем да апошняга моманту. Усе гэтыя аспекты трымаліся недзе далёка ў галаве, а беларускія балельшчыкі, з якіх, дарэчы, многія адправіліся ў Маскву, верылі, што нашы дзяўчаты змогуць перамагчы.**



У першы дзень матча маскоўскія «Лужнікі» не былі запоўненыя пад завязку, хоць дзяўчаты і паказвалі якасны тэніс. У стартавай сустрэчы на корт выйшлі Аляксандра Сасновіч (100-ы нумар сусветнага рэйтынгу) і Дар'я Касаткіна (32-я ракетка свету). Хоць маладая расіянка ў трох сэтах і аказалася мацнейшай за Аляксандру, перавага зборнай Расіі трымалася нядоўга. Роўнасць у матчы была хутка аднаўлена першым нумарам нашай зборнай Вікторыяй Азаранкай, якая не пакінула шанцаў Маргарыце Гаспаран — 6:2, 6:3.

У нядзелю масквічы падцягнуліся ў «Лужнікі» ўжо больш вялікім складам, бо другі дзень матча павінен стаць вырашальным. Нерваваліся балельшчыкі, капітаны, ды і самі спартсменкі. Першымі на кортах з'явіліся лідары каманд — Азаранка і Касаткіна. Вікторыя са старту паядынку захапіла перавагу і без праблем узяла першы сэт, а вось другі склаўся куды больш драматычна. У гульню ўмяшаліся трыбуны, раз-пораз на падачы беларускі расійскія «знатакі» тэніса шумелі, а калі мяч трапляў у корт крычалі «аўт». Вікторыя пачала нерваваціца, а Дар'я тым часам, правяла пару-тройку ўдалых розыгрышаў, тым самым выйграўшы другі сэт. У трэцяй партыі нервавалася ўжо маладая расіянка, чым і змагла скарыстацца Азаранка, вырваўшы перамогу ў сустрэчы — 6:2, 5:7, 6:3.

Самая вялікая нагрузка, здаецца, лягла зноў на плечы Аляксандры Сасновіч, якой пасля свайго няўдалага паядынку трэба было сустракацца з Маргарытай Гаспаран і, магчыма, вырашыць лёс усяго матчу. Іх гульня сталася напружанай, няроўнай і вельмі ўпартай. Нягледзячы на гэта і праявіўшы ўсе свае найлепшыя якасці, Аляксандра атрымала перамогу — 4:6, 6:1, 7:5 і вывела беларусак у Сусветную групу Кубка Федэрацый. Парная сустрэча, якая была згуляна пазней, ужо не мела турнірнага значэння.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА павіншаваў жаночую нацыянальную каманду па тэнісе.** *«Беларускі жаночы тэніс па праве заслужыў сваё месца ў Сусветнай групе Кубка Федэрацыі, і сёння вы здабылі гэту гістарычную перамогу ў самым цяжкім процістаянні з расійскімі тэнісісткамі ў Маскве. Уся краіна з заміраннем сэрца сачыла за ўпартымі паядынкамі, у якіх вы прадэманстравалі высокую вытрымку і волю да перамогі. Вялікі дзякуй вам за гэту перамогу!»* — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што беларускія тэнісісткі змогуць замацавацца на заваяваных пазіцыях і падарыць у будучым шмат станоўчых эмоцый і незабыўных перажыванняў за Беларусь на найбуйнейшых тэнісных турнірах.

Такім чынам, каманда Беларусі абыграла зборную Расіі — 3:2 і вярнулася ў эліту сусветнага тэніса, дзе не была з далёкага 1994 года. Адзначым, што разам са зборнай Беларусі ў наступным годзе за Кубак будуць змагацца каманды ЗША, Іспаніі і Германіі, якія вярнуліся ў Сусветную групу, а таксама цяперашнія паўфіналісты — Швейцарыя, Чэхія, Францыя і Нідэрланды.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СУР'ЁЗНАЯ АЦЭНКА

## Урад павінен згрупавацца ў вырашэнні задач па сацыяльна-эканамічнаму развіццю краіны

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў, прымаючы справаздачу аб выніках развіцця краіны ў першым квартале бягучага года і мерах па павышэнні эфектыўнасці эканомікі, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

«У мінулым годзе мы дамовіліся аб развіцці нашай краіны ў бягучым годзе. Былі пастаўлены канкрэтныя задачы. Тады мы дамовіліся, што па паўгоддзі дадзім сур'ёзную ацэнку рабоце адпаведных структур, перш за ўсё ўрада, Нацыянальнага банка, службовых асоб, у тым ліку губернатараў, па развіцці Беларусі ў гэтым годзе і выкананні даведзеных заданняў. Першая адсечка — першы квартал. Ён прайшоў. Паўгоддзе — гэта падвядзенне вынікаў з адпаведнымі высновамі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Матрыца задач для вертыкалі ўлады ў мяне на стале. Чырвоным колерам абазначана тое, што не выканана. Сіні колер — поспехі ў выкананні планавых заданняў. Гэта матрыца ў цэлым у чырвоным колеры. Хацелася б пачуць тлумачэнні ў сувязі з гэтым, — заявіў Прэзідэнт. — У кожнага перад вачамі павінен ляжаць план развіцця на гэты год. Таму далажыце, як ён выкананы (па выніках першага квартала. — **Заўвага БЕЛТА**). Калі дрэнна, то чаму».

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што па існуючай практыцы за тыя ці іншыя праблемы прынята вінаваціць урад і губернатараў. Разам з тым, лічыць Аляксандр Лукашэнка, сур'ёзную долю адказнасці павінны несці і вышэйшыя службовыя асобы, якія маюць адпаведныя шырокія паўнамоцтвы і статус. У сувязі з гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што пры адсутнасці дадатнай дынамікі і вынікаў ім будуць прымацца кадравыя рашэнні.

«Гэта тычыцца ўсіх. У вас яшчэ ёсць квартал для таго, каб згрупавацца і паказаць адпаведныя вынікі. Калі не, прыйдуць іншыя людзі, якія павінны гэтым займацца. Таму збірайцеся разам і дзейнічайце. Калі нехта штосьці не цягне, уносьце неадкладна прапановы. Схавацца за спіну каго б там ні было не атрымаецца», — заявіў беларускі лідар.

Асобна кіраўнік дзяржавы нагадаў аб ролі Адміністрацыі Прэзідэнта як палітычнага штаба Прэзідэнта па ажыццяўленні галоўнага кантролю за работай розных дзяржаўных структур: «Усе рашэнні мною прыняты. Ваша задача — выразна і адназначна дакладваць, што адбываецца і што будзем рабіць. Не зацягваючы, не бюракратызуючы ні адзін з працэсаў, не прапускаючы міма ні адной з талковых прапаноў».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што далейшай стратэгіі развіцця Беларусі ў гэтым годзе будуць прысвечаны два важныя мерапрыемствы. Першае — Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу — і другое, самае галоўнае, — Усебеларускі народны сход, дзе будуць канчаткова з улікам існуючага вопыту і дасягнутых вынікаў вызначаны задачы на перспектыву.

Як было дакладзена на нарадзе, нягледзячы на складанасці з выкананнем паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, па шэрагу напрамкаў намецілася станоўчая тэндэнцыя. У цэлым сітуацыя ў эканоміцы Беларусі застаецца кіруемай, забяспечваецца макраэканамічная стабільнасць.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць максімальна выкарыстоўваць існуючыя магчымасці па нарошчванні экспарту. Пра наяўнасць рэальнай цікавасці да беларускай прадукцыі ў тым ліку сведчаць вынікі перамоваў Прэзідэнта з замежнымі лідэрамі, якія нядаўна прайшлі на палях саміту Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва.

На парадку дня застаецца і задача па павышэнні эфектыўнасці на вытворчасцях, зніжэнні выдаткаў. Кіраўнік дзяржавы нагадаў пра пераслед ад магчымага жадання выканаць гэты паказчык за кошт саміх работнікаў у выглядзе звальнення або ўразання сацпакету. Але разам з гэтым нязменнымі застаюцца патрабаванні да падтрымання працоўнай дысцыпліны і прафесіяналізму кадраў на ўсіх узроўнях.

# РАДЫЯФОБІІ НЕ ПАДДАЦЦА, НЕБЯСПЕКУ НЕ ІГНАРАВАЦЬ

**На Гомельшчыне разам з удзельнікамі прэс-тура, прымеркаванага да 30-годдзя катастрофы на ЧАЭС, пабываў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА.**



**Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА з дырэктарам РНПЦ Аляксандрам РАЖКО і намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімірам ПРЫВАЛАВЫМ.**

Сваімі ўражаннямі прадстаўнікі расійскіх СМІ, сярод якіх было некалькі вядомых блогераў, дзяліліся ў анлайн-рэжыме. Вынікі падводзілі ў самай аўтарытэтнай медыцынскай установе вобласці — Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека. Рыгор Рапота выказаў свае ўражанні і спадзяванні:

— Важна зразумець, што адбылося 30 гадоў таму і што адбываецца насамрэч сёння. Што такое радыяцыйнае забруджванне, якія формы яно мае, як яно можа распаўсюджвацца і ўплываць на чалавека. Дзе тая мяжа бяспекі, калі трэба рабіць пэўныя дзеянні. З аднаго боку, важна не паддацца радыяфобіі, а з другога — нельга недаацэньваць небяспеку там, дзе яна рэальна існуе. Аказваецца, нават розныя грыбы па-рознаму рэагуюць на радыяцыю. Апенькі самыя бяспечныя, а маслякі становяцца атрутай. Цецярук з'ядае пупышкі, у якіх назапашваецца радыяцыя, таму на тэрыторыі побач з зонай я на паляванне на яго не пайду. Усё, пра што нам расказалі спецыялісты Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка, важна ведаць не толькі з пункту гледжання радыяцыі, але і ўвогуле экалагічнага становішча.

Гомельшчына — найбольш пацярпелы рэгіён. Досведу ліквідацыі наступстваў катастрофы такога маштабу ў свеце не было і няма. Пры наведванні РНПЦ пераканаўся, што грошы Саюзнай дзяржавы выдаткоўваюцца на развіццё навукі і медыцыны недарма. Будзем і далей працаваць над сумеснымі праграмамі.

Сёння фарміруецца канцэпцыя новай, пятай, чарнобыльскай праграмы Саюзнай дзяржавы. У ёй будзе закладзены бюджэт пад спецыфічныя навуковыя даследаванні, маніторынг, спецыялізаваную высокатэхналагічную медыцынскую дапамогу, развіццё тэлемедыцыны.

Між тым журналісты выказалі пажаданне зрабіць зону адчужэння больш даступнай для наведванняў. Тым больш ужо існуе маршрут, па якім можна рухацца без рызыкі для здароўя. Дарэчы, яны ўвогуле лічаць, што поўдзень Беларусі трэба «раскручваць» больш актыўна ў інтэрнэт-прасторы. **Алена АЎЧАРЭНКА, галоўны рэдактар часопіса «Саюзная дзяржава»**, гаворыць, што цікавыя турыстычныя аб'екты расійскія турысты пакуль не ведаюць:

— Гомельшчына для расіян — непазнаная зямля. На жаль, няма агульнага рэсурсу з поўнай інфармацыяй пра мясцовыя славутасці. Напрыклад, інфармацыю пра Веткаўскі музей стараверства трэба збіраць па розных крыніцах. Улічваючы цяперашнюю сітуацыю з Турцыяй і Егіптам, курсамі валют, расіяне паедуць у Волагду і Кастраму. А чаму не ў Ветку ці ўнікальны Тураў, дзе з-пад зямлі растуць крыжы? Трэба актыўней прасоўваць, рэкламаваць, паказваць і расказваць, што ў вас ёсць цікавае. Віцебскую вобласць расіяне ведаюць дзякуючы «Славянскаму базару», Гомельшчына ж цікавая не ў меншай ступені.

Яшчэ адна прапанова расіян здалася вартай увагі дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты. Размова пайшла пра стварэнне музея, які будзе даваць цэласнае ўяўленне пра наступствы чарнобыльскай катастрофы.

— Гэтая прапанова мае сэнс. Экспазіцыя ў Хойніцкім раённым музеі цікавая, але яе ёсць чым дапоўніць. Важна не толькі ўразіць гледача і выціснуць з яго эмоцыі. Ёсць сэнс расказваць і пра тое, што адбываецца ў гэты момант. Магчыма, трэба развіваць турызм у гэтай зоне, што таксама будзе садзейнічаць знікненню радыяфобіі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Зялёны горад

# ПРЫРОДНЫ ААЗІС СЯРОД НОВАБУДОЎЛЯЎ

## У мікраараёне «Каменная Горка» з'явілася экасцежка

**Драчы амаль зніклі ў Еўропе, у Беларусі від занесены ў Чырвоную кнігу. Але дзіва: дзве пары рэдкіх птушак арнітолагі заўважылі ў ляску на тэрыторыі прыхода храма Свяціцеля Мікалая Японскага.**

Сёння на невялікім лапіку зямлі, дзе раскінуліся лясок і вадаём, па ўсю моц вiруе жыццё: шэрыя курапаткі, галубы вялікія, салаўі, дразды, пеначкі-ценькаўкі, жоўтагаловыя каралькі — папярэдне арнітолагі налічылі некалькі дзясяткаў відаў птушак. Акрамя іх, тут можна ўбачыць чырвонакніжнага матыля махаона і рэдкую лекавую расліну чыну чорную. Праект экасцежкі з'явіўся дзякуючы супрацоўніцтву некамерцыйнай грамадскай арганізацыі «Цэнтр экалагічных рашэнняў», прыхода храма Свяціцеля Мікалая Японскага Беларускай Праваслаўнай Царквы і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі.

Экасцежка ўяўляе сабой кальцавы маршрут, на кропках-прыпынках якога размешчаны інтэрактыўныя стэнды. На кожным нанесены штрыхкод, які накіроўвае на старонку, дзе можна паслухаць птушыныя галасы і праглядзець тэматычныя відэа. У канцы маршруту экскурсанты маюць магчымасць зрабіць сэлфі на фоне сцежкі і заадно праверыць свае веды па батаніцы і заалогіі.

— На невялікім лапіку зямлі гараджане могуць убачыць як звычайныя, так і рэдкія віды птушак, што вельмі каштоўна, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА**. — Міністэрства абавязкова будзе падтрымліваць падобныя праекты. На маю думку, да іх варта прыцягваць мясцовых жыхароў.

— Мы атрымалі ўнікальны наглядны даведнік, як чалавек уплывае на навакольнае асяроддзе, — падзяліўся думкамі **захавальнік сцежкі, протаіерэй, настаяцель храма Павел СЯРДЗЮК**. — Спадзяемся, экасцежку не абыдуць увагай і адукацыйныя ўстановы.

**Кацярына РАДЗЮК.** *radziuk@zviazda.by*

■ Вынікі тыдня

# МАГЧЫМАСЦІ ЗНОЙДЗЕНЫЯ І СТРАЧАНЫЯ



Адной з самых доўгачаканых падзей мінулага тыдня была **сустрэча ў горадзе Доха (Катар)**, на якой разглядалася магчымасць замарозкі здабычы нафты найбуйнейшымі вытворцамі ў мэтах павышэння цаны. Брокеры на фондавых біржах выказвалі з яе нагоды пэўны аптымізм — перад сустрэчай у нядзелю цэны на нафту выйшлі на ўзровень, на якім даўно ўжо не былі, — больш як 43 долары за барэль. Рост цэн на нафту дапамог бы і беларускаму бюджэту, паколькі Беларусь прадае за мяжу сотні пазіцый нафтахіміі, якія ўпалі ў цане ўслед за самой нафтай. Але цэнтральнай праблемай сустрэчы і магчымай дамоўленасці былі супярэчнасці паміж пазіцыямі Саудаўскай Аравіі, якая была гатова замарожваць здабычу, толькі калі гэта зробяць усе асноўныя гульцы на рынку, і Ірана, які паслядоўна заяўляў, што не будзе замарожваць здабычу, пакуль не выйдзе на дасанкцыйны ўзровень здабычы, што зойме яшчэ шмат месяцаў. У выніку цуду не адбылося, абодва бакі не адмовіліся ад сваіх раней агучаных пазіцый (Іран нават не стаў удзельнічаць у сустрэчы), і здзелка па замарозцы здабычы нафты не была дасягнута. Больш за тое, некаторыя краіны АПЕК, якія ўдзельнічалі ў сустрэчы, вылучылі новыя патрабаванні аб тым, каб акрамя Ірана здабычу замарозілі і нейкія іншыя буйныя вытворцы, якія не ўваходзяць у арганізацыю. Ужо ў першыя хвіліны таргоў панядзелка рынак адрэагаваў падзеннем цаны на нафту адразу на шэсць працэнтаў.

**Вынікі выбараў у парламент у Сірыі** аказаліся чаканымі. Нягледзячы на тое, што да самой ідэі выбараў у ваюючай краіне Захад паставіўся адмоўна, яны адбыліся, і кааліцыя «Нацыянальнага адзінства» (якая ўключае кіруючую партыю Баас) атрымала 200 з 250 месцаў у сірыйскім парламенце. Адметна, што выбары прайшлі ў 13 з 15 правінцый краіны, што гаворыць пра грунтоўнасць улады ў Сірыі.

Для прэзідэнта Бразіліі Дзілмы Русеф настаў чорныя часы. 12 красавіка спецкамісія бразільскага Кангрэса з удзелам прадстаўнікоў усіх палітычных партый краіны ўхваліла **імпічмент прэзідэнту Дзілме Русеф**. Спецкамісія паверыла ў тое, што падчас першых прэзідэнцкіх выбараў спадарыня Русеф прыцягвала незаконнае фінансаванне на сваю выбарчую кампанію са сродкаў буйной нафтавай кампаніі Petrobras, старшынёй савета дырэктараў якой была. У нядзелю пазіцыю спецкамісіі падтрымала і ніжняя палата парламента дзвюма трацінамі галасоў. Наступным крокам з'яўляецца галасаванне ў Сенаце, дзе спатрэбіцца толькі простая большасць галасоў.

Як вядома, супрацьстаянне Расіі і Турцыі з прычыны збітага турэцкай ваеннай авіяцыяй расійскага бамбардзіроўшчыка ўжо мела сваімі наступствамі мільярды долараў страт у таваразвароце дзвюх краін. На мінулым тыдні намеціўся новы нечаканы паварот, які ў будучыні можа нанесці ўзаемнаму гандлю дзвюх краін яшчэ больш моцны ўдар. Прэзідэнт Ірана Хасан Роухані заявіў пра **гатоўнасць Ірана стаць гарантам энергетычнай бяспекі Турцыі**, забяспечыўшы ўсе патрэбы краіны па нафце і газе. У дадзены момант 60 працэнтаў усяго спажыванага газу Турцыя купляе ў Расіі, што прыносіць расійскаму бюджэту вялікія сродкі. Адзінай надзеяй на захаванне статус-кво для расійскага экспарту газу з'яўляецца той факт, што ў Турцыі з Іранам ёсць не меншыя супярэчнасці, чым з Расіяй.

Для беларускай знешняй палітыкі галоўнай падзеяй стаў **візіт Прэзідэнта Беларусі на саміт Арганізацыі ісламскага адзінства**. Сама па сабе гэта арганізацыя яшчэ не раскрыла той патэнцыял, які мог бы ў яе быць, улічваючы, што складаецца яна з 57 дзяржаў з насельніцтвам больш як мільярд чалавек. Галоўныя праблемы — дыспрапорцыі, якія ёсць у яе ўдзельнікаў. Адны з іх з'яўляюцца казачна багатымі, як Саудаўская Аравія і Катар, іншыя — зусім беднымі, як Сенегал. Вельмі малы ўзаемны гандаль, што заўсёды з'яўляецца негатыўным фактарам для збліжэння пазіцый. Вялікая геаграфічная аддаленасць найбуйнейшых па насельніцтве краін — удзельніц арганізацыі. Ёсць шмат супярэчнасцяў наконт тлумачэння ісламу з пункту гледжання той ці іншай пануючай плыні, па яго інтэрпрэтацыі ў асобных краінах. Але галоўным для Беларусі з'яўляецца той факт, што на саміце, які праводзіцца раз у тры гады, прысутнічаюць лідары краін-удзельніц, што дае бясцэнныя магчымасці для асабістых перагавораў па развіцці адносін. Улічваючы шматвектарную палітыку Беларусі, гэта цудоўная магчымасць дамовіцца аб новых кірунках супрацоўніцтва і нарошчванні беларускага экспарту ў сітуацыі, калі галоўныя рынкі збыту беларускай прадукцыі — Расія і Украіна — па прычыне эканамічных праблем больш не могуць забяспечыць ранейшыя аб'ёмы збыту беларускай прадукцыі. Аляксандр Лукашэнка правёў пасяховыя перамовы з вышэйшымі службовымі асобамі Турцыі, Казахстана, Пакістана, Афганістана, Катара, Інданезіі і шэрагу іншых краін.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Заданне на заўтра

# ВУЧЫЦЬ НЕАБХОДНА ПА-НОВАМУ

**«Сярэдняй школе па ўзроўню ведаў, па падрыхтоўцы настаўнікаў, па аснашчэнні я паставіў бы моцную «сямёрку», — заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

Кіраўнік галіны спадзяецца, што праз некалькі гадоў тут будзе стаяць ужо моцная «дзявятка». «Пакуль нам ёсць над чым працаваць», — канстатаваў ён. А вось беларускім ВНУ міністр адукацыі паставіў толькі «шасцёрку».

— Я не вельмі задаволены сітуацыяй, якая складваецца ў вышэйшай школе. Па многіх пазіцыях ВНУ вельмі добра глядзяцца, але ў нас не назіраецца такога дынамізму, як у найлепшых еўрапейскіх універсітэтах, — падкрэсліў міністр. — Сістэма адукацыі не павінна стаяць на месцы. Калі мы пакінем вышэйшую адукацыю на цяперашнім узроўні, то адстанем ад рэчаіснасці. Вучыць неабходна па-новаму.

Некаторыя лічаць, што паняцце класічнага універсітэта праз некалькі гадоў сыдзе ў нябыт. Яго нібыта цалкам заменіць дыстанцыйнае навучанне... Але Міхаіл Журaўкоў такую думку не падзяляе: «Мы катэгарычна супраць гэтага. Усё ж такі класічную, фундаментальную адукацыю трэба пакінуць, але абавязкова яе перайначыць. Пры гэтым сучасная адукацыя павінна грунтавацца на тым найлепшым, што было ўласціва савецкай вышэйшай школе — на яе фундаментальнасці. Разам з тым яна павінна быць набліжана да рэчаіснасці, стаць больш практыка-арыентаванай».

Яшчэ адно хваравітае пытанне — практыка так званых «школьных пабораў».

— Я не магу сказаць, што з гэтым навялі парадак усюды і цалкам. Але ў школах правялі гутаркі і папярэдзілі, што збор грошай павінен адбывацца толькі праз апякунскія саветы, — падкрэсліў Міхаіл Журaўкоў.

Па словах міністра, апякунскія саветы — гэта добраахвотныя аб'яднанні бацькоў, спонсараў, якія, акрамя аказання дапамогі, кантралююць паступленне грошай і іх расходаванне. «Практыка існавання апякунскіх саветаў ёсць ва ўсіх краінах свету», — адзначыў Міхаіл Журaўкоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Падпіска-2016

# ЧАС СЕЯЦЬ! І ПАЛІВАЦЬ...

**Квадрат не круг, а будны дзень не свята. Але ж стаць ім можа, калі раптам (або і не раптам) завітае госць, калі пашчасціць зрабіць нешта людскае... А калі яшчэ і добрым людзям...**



Фота Надзеі БУЖАН.

Днямі ў сценах рэдакцыі адбыўся чарговы розыгрыш прызоў. Лёсы іх, паводле добрай звяздоўскай традыцыі, вяршылі госці — нашы падпісчыкі. Гэта значыць, што менавіта ім — на гэты раз Людміле Іванаўне Бераставай і Сяргею Іванавічу Жукаву (на здымку) — было даверана права выцягнуць з «чароўнага» капелюша так званыя шчаслівыя купоны, першым парадавацца за прызёраў і, вядома ж, паперажываць — за вёску, за дачнікаў. Бо прызы — для іх. Такім чынам

## ПАЛІВАЛЬНЫ НАБОР KARCHER ВЫЙГРАЛІ:

**Аляксей Васілевіч Шчэрба, г. Кобрын Брэсцкай вобласці;**

**Зоя Сафронаўна Скурат, в. Азерцы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці;**

**Аляксандр Сяргеевіч Ганчароў, в. Нісімкавічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці;**

**Зоя Канстанцінаўна Бурсевіч, г. Слонім Гродзенскай вобласці;**

**Алеся Уладзіміраўна Фяцісава, г. Клімавічы Магілёўскай вобласці;**

**Міхаіл Уладзіміравіч Валілевіч, в. Старыя Габы Мядзельскага раёна Мінскай вобласці;**

**Тэрэза Чэславаўна Вайтковіч, г. Мінск.**

## СУПЕРПРЫЗ — ЦЯПЛІЦУ — ВЫЙГРАЛА

**Ромця Аляксандраўна Фурман з в. Магільна Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.**

Варта сказаць, што ў гэтай, апошняй, вёсцы адзін звяздоўскі суперпрыз ужо ёсць: гадоў колькі таму рэдакцыя ўручыла яго сваёй адданай прыхільніцы і прапагандыстцы Галіне Міхайлаўне Нічыпаровіч. Таму цяпер менавіта ў яе распыталі пра сям'ю Фурманаў. І даведаліся, што людзі гэта вельмі паважаныя, што «Звязду» выпісваюць даўно, што сама Ромця Аляксандраўна працуе настаўніцай, трымае гаспадарку. «А вось ці ёсць у іх парнік, далібог не ведаю, — прызналася Галіна Міхайлаўна. — Фурманы ў другім канцы вёскі жывуць. А я ж паштальёнкай ужо не працую, на пенсіі».

Значыць, будзем спадзявацца, што парніка няма, альбо той, што ёсць, ужо стары, альбо ў гаспадарцы спатрэбіцца яшчэ адзін...

А зрэшты, продкі, відаць, не памыляліся, калі казалі, што на смачны кусок знойдзецца раток.

Таму шчыра віншуем усіх шчаслівчыкаў!

Тым жа, каго ўдача абышла, скажам: не засмучайцеся. Зноў выбірайце «Звязду», чытайце, дасылайце карткі на розыгрыш прызоў. Шанц на выйгрыш ёсць у кожнага і заўсёды.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 284 44 04.

**Афіцыйна**

Арганізатарам рэкламнай гульні «Падарунак сейбітам» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэкламная гульня «Падарунак сейбітам!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 10.03.2016 г. (пасведчанне № 2714) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 16 сакавіка па 30 чэрвеня 2016 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» другога квартала або першага паўгоддзя 2016 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 287 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# Як не зарабіць абмаражэнне на... пажары?

**Нядаўна ў адным са сталічных гандлёвых цэнтраў ратаўнікі правялі незвычайную акцыю. Увагу прыцягваў столік, на якім стаялі абгарэлыя электрапрыборы. Корпус старога пластмасавага дыскавага тэлефона скруціўся разы ў два.**

Побач з ім стаяў счарнелы ад агню факс, у якім нейкім цудам захавалася палова верхняй панелі. Ляжалі аплаўленыя разеткі з уключанымі штэпселямі, якія ўжо адтуль не дастанеш. А пра тое, якую функцыю выконвалі іншыя прадметы, можна толькі здагадвацца.

— Тут можна нават конкурс арганізоўваюць — «Угадай прыбор», — сумна жартуе **начальнік цэнтра прапаганды Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Павел ФІЛІМОНАЎ**. — Мы сюды прывезлі абгарэлыя рэчы з рэальных пажараў, якія дагэтуль патыхаюць дымам. А пачыналіся многія з іх з-за пакінутай у разетцы зарадкі мабільнага тэлефона ці тэлевізара ў рэжыме чакання. Да таго ж зусім мала часу засталося да летніх канікул і доўгіх майскіх выхадных. Таму мы вырашылі лішні раз нагадаць бацькам і дзецям аб працэйшых правілах бяспекі.

А паралельна афіцэры МНС вучылі наведвальнікаў гандлёвага цэнтра абыходзіцца з вогнетушыцелямі.

— Ці карысталіся калі-небудзь гэтым прыборам? Не? Ну тады глядзіце і слухайце, — у руках **старшага інспектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Партызанскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Паўла АПЯЦЁНКА** ладны макет вогнетушыцеля лятае, як матылёк. — Самая грубая памылка, якую можна дапусціць — гэта трымаць яго за раструб. Справа ў тым, што тэмпература на выхадзе вуглекіслаты дасягае мінус 50 градусаў. Таму зарабіць моцнае абмаражэнне на пажары можна вельмі проста, як бы гэта парадаксальна ні гучала. Тушыць полымя ім можна на адлегласці ў метр-паўтара. Праўда, вогнетушыцель дзейнічае толькі на пачатковых стадыях пажару... Калі яго выкарысталі хоць раз, то абавязкова



нясіце на перазарадку, нават калі тушэнне працягвалася лічаныя секунды. І нават калі пяць гадоў ён у вас прастаяў без справы, перазарадзіць апарат таксама трэба.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ВЕЦЕР З ПОЎНАЧЫ: ПАХАЛАДАЕ, ДАЖДЖЫ І НАВАТ МОКРЫ СНЕГ

Удзень будзе толькі ад 4 да 11 цяпла

**На гэтым тыдні ў нас будзе халаднавата, ветрана і вільготна, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Справа ў тым, што ў першую палову тыдня над Скандынаўскім паўвостравам будзе гаспадарыць цыклон, па перыферыі якога на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць даволі свежая паветраная маса з поўначы Еўропы. У сераду ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Уначы — 1-6 цяпла, пры праясненнях — ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень будзе ад плюс 4 градусаў па поўначы да 11 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

Мокры снег і дождж будзе месцамі і ноччу на чацвер. Удзень гэтыя ападкі пройдуць пераважна па ўсходняй палове Беларусі. Уначы — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 4-11 цяпла. У пятніцу цераз нашу краіну будзе рухацца чарговы атмасферны фронт, які прынясе з боку Балтыйскага мора кароткачасовыя дажджы, а па паўночным усходзе — дождж і мокры снег. Уначы — ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень будзе плюс 6-13 градусаў, па поўдні — да 15 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, халоднае надвор'е з ападкамі чакаецца і на выхадныя. Так, у суботу месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, уначы па поўначы магчымы мокры снег. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-6 цяпла, пры праясненнях — ад нуля да мінус 2 градусаў, удзень — 6-13 цяпла. Кароткачасовыя дажджы чакаюцца месцамі і ў нядзелю. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1-6 градусаў, але пры праясненнях — да мінус 2 градусаў, удзень будзе 8-15 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ДАПАМАГАЦЬ — ГЭТА ПРОСТА!

Ланцужок беларускіх сэрцаў

**У Мінску выступіў славуты аўстралійскі матывацыйны аратар Нік Вуйчыч. «Вялікай колькасці людзей у Беларусі патрэбна больш любові» — цяжка не пагадзіцца з гэтымі словамі Ніка.**

Як проста можна дапамагчы чалавеку, Нік Вуйчыч паказаў на ўласным прыкладзе. Ён напісаў ліст з запрашэннем сустрэцца выхаванцу Рэчыцкага дома-інтэрната адзінаццацігадоваму хлопчыку Адаму Эсэрту, які нарадзіўся без рук. Сустрэча маленькага беларуса і вядомага аўстралійца адбылася непасрэдна перад выступленнем Ніка на «Мінск-Арэне». Яна была зусім кароткай. Колькі добрых фраз, мноства ўсмешак, пазітыўная энергія, сумеснае сэлфі. Адам падарыў Ніку кнігу пра Беларусь, якую ўласна падпісаў... зубамі. «Я люблю цябе!» — «Я таксама цябе люблю!» Але ж не ў часе тут справа, а ў шчырасці. Адам займаў сваё месца ў зале і быў шчаслівы. Наўрад ці хлопчык калі-небудзь забудзе гэтую сустрэчу і тыя словы, якімі дзяліўся Нік Вуйчыч з беларусамі.

«Грамадства будзе прагрэсіраваць, калі вы будзеце дапамагаць самі сабе. Не чакайце дапамогі ад дзяржавы. Кожны можа рэальна дапамагаць». І далей ён растлумачыў — можна грашыма, а можна проста чалавечай любоўю: «Схадзіце ў бліжэйшы анкалагічны цэнтр, паспрабуйце рассмяшыць хворых дзяцей, проста пабудзьце побач з імі!»

Колькі валанцёраў, валанцёрскіх арганізацый, ды і проста звычайных людзей дапамагаюць іншым у бядзе штодзень! Хтосьці зборам грошай, цацак, прадметаў гігіены. А хтосьці займаецца клоунатэрапіяй, арганізуе тэатры, разнастайныя гурткі для дзяцей і дарослых з асаблівасцямі, каб тыя маглі рэалізаваць сябе! Здаецца, сёння беларускае грамадства сапраўды ведае, як падтрымаць адно аднаго. Дзякуй, Нік Вуйчыч, што яшчэ раз нагадаў, што такое дапамога, давер і любоў!

**Паліна ЛІСОЎСКАЯ.**

# ЗАСЫПАЛА Ў КАЛОДЗЕЖЫ

**У Мінскім раёне пры ўладкаванні калодзежа грунтам засыпала двух чалавек.**

Паведамленне выратавальнікам пра абрушэнне катлавана паступіла з вёскі Прылуцкая Слабада. Глыбіня каналізацыйнага калодзежа складала восем метраў. У выніку засыпанымі апынуліся два чалавекі. Аднаго з іх — 18-гадовага студэнта аднаго са сталічных каледжаў — да прыезду работнікаў МНС дасталі з катлавана без бачных пашкоджанняў мясцовыя жыхары. Пасля агляду медыкамі яму паставілі папярэдні дыягназ «закрытая чэрапна-мазгавая траўма лёгкай ступені, тупая траўма грудной клеткі», але ў шпіталізацыі хлопец патрэбы не меў. Другога пацярпелага — 26-гадовага хлопца — выратавальнікі дасталі пры дапамозе спецыяльных вяровак. Ён знаходзіўся ў непрытомным стане, медыкі канстатавалі ў яго шматлікія траўмы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Экспартныя перспектывы

# ЗНАЙСЦІ ЗАМЕЖНАГА ПАКУПНІКА

## Айчынным прадпрыемствам патрэбна маркетынгавая падтрымка




**Каб палепшыць нашы экспартныя паказчыкі, трэба, перш за ўсё, вырашыць шэраг праблем у міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Такую думку падчас «круглага стала», што прайшоў у Нацыянальным цэнтры маркетынгу і кан'юнктуры цэн, выказаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы. Падчас мерапрыемства былі разгледжаны вынікі грамадскага абмеркавання праекта Нацыянальнай праграмы падтрымкі і развіцця экспарту на 2016—2020 гады.**

«Рознымі метадамі ў суседняй краіне рэгулюецца аказанне дзяржаўнай падтрымкі і доступ замежных вытворцаў на рынак Расіі, — адзначыў парламентарый. — Пад рэгуляванне падпадаюць і пастаўкі з Беларусі. Гэта тычыцца і ваенна-тэхнічнай прадукцыі, і прадукцыі сельгасмашынабудавання. Таму, мне здаецца, той блок, які тычыцца вырашэння пытанняў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і ўвогуле пытанняў працы нашых экспарцёраў на рынку Еўразійскага эканамічнага саюза, патрабуе вельмі дэтальнай прапрацоўкі. Інакш як бы ні біліся нашы прадпрыемствы над якасцю і цаной, пытанні па фінансаванні рэалізацыі нашай тэхнікі на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі застануцца — да таго часу, пакуль на самым высокім узроўні не будуць дадзены адпаведныя даручэнні. Мы працуем у няроўных умовах».

Па словах Уладзіслава Шчэпава, ёсць таксама звароты з Алтайскага края, з шэрагу іншых расійскіх рэгіёнаў па развіцці шоу-румаў, сэрвіснага забеспячэння нашай тэхнікі. «Але гэта, безумоўна, пытанні, звязаныя з грашыма, — звярнуў увагу прадстаўнік парламента. — Зразумела, што экспарт патрабуе фінансавання, таму калі ў праграме напісана, што яна не запатрабуе дадатковых выдаткаў з рэспубліканскага бюджэту, з іншых бюджэтаў, то гэта, відаць, не зусім правільна. Патрэбна закласці нейкія крыніцы».

Дэпутат таксама звярнуў увагу, што з праграмы развіцця экспарту «выпадаюць» свабодныя эканамічныя зоны. «Гэта ж велізарны суб'ект інфраструктуры! — заявіў Уладзіслаў Шчэпаў. — На маю думку, мы мала надаём увагі суб'ектам падтрымкі экспарту, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны. Напрыклад, свабодным эканамічным зонам. Сапраўды, ёсць парк «Вялікі Камень», Парк высокіх тэхналогій. Але ж ёсць яшчэ вышэйшыя навуковыя ўстановы, якія ажыццяўляюць экспарт адукацыйных паслуг за межы Рэспублікі Беларусь».

Падчас «круглага стала» **намеснік дырэктара дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Руслан ЕСІН** праінфармаваў прысутных аб тых прапановах, якія паступілі падчас грамадскага абмеркавання праекта Нацыянальнай праграмы падтрымкі і развіцця экспарту на наступную пяцігодку. У сваю чаргу ўдзельнікі сустрэчы станоўча ацанілі дапрацаваны праект гэтага дакумента. Пры гэтым яны асабліва адзначылі мэтазгоднасць развіцця асобных яго палажэнняў, якія тычацца пашырэння інфармацыйнай і маркетынгавай падтрымкі, што аказваецца беларускім экспарцёрам. Важным, па словах выступоўцаў, з'яўляецца і ўдасканаленне сістэмы ўзаемадзеяння ў гэтай сферы паміж дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі, якія адказваюць за напрамак.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ПРАТЭРМІНАВАНЫЯ ПРАДУКТЫ СТАНОВЯЦЦА ЭНЕРГІЯЙ

**На Брэсцкім смеццеперапрацоўчым заводзе пачалі атрымліваць дадатковую энергію з прадуктаў, у якіх скончыўся тэрмін прыдатнасці. Цяпер на завод прывозяць каўбасы, паўфабрыкаты, агародніну і садавіну супермаркеты, таксама астаткі ежы дастаўляюць з рэстаранаў і іншых прадпрыемстваў грамадскага харчавання.**

Раней гэтыя арганічныя адходы выкідвалі проста на звалку, цяпер іх разам з іншымі гарадскімі бытавымі адходамі перапрацоўваюць у біягаз. Для гэтага астаткі прадуктаў змяшчаюць у спецыяльныя ёмістасці, дзе яны бродзяць прыкладна тры тыдні. Потым атрыманы газ ачышчаюць і спальваюць у міні-ТЭЦ. Выпрацаваная такім чынам электраэнергія паступае ў гарадскія сеткі.

Паводле інфармацыі **начальніка аддзела смеццеперапрацоўчага завода Наталлі ТРЫФАНАВАЙ**, летась было перапрацавана 16 тысяч тон арганічных адходаў. З іх дзве з паловай тысячы тон паступіла ад юрыдычных асоб: прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання. Спецыялісты падлічылі, што электраэнергіяй, атрыманай з біягазу, можна забяспечыць каля дзвюх тысяч прыватных дамоў. Выпрацоўку гэтага віду паліва на заводзе плануюць павялічваць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

# Бліжэй да рынку Пакістана

**Беларусь наведала дэлегацыя з Пакістана на чале з міністрам прамысловасці і вытворчасцяў Ханам ЖАТОЕМ. У праграме дзелавога візіту было азнаямленне з шэрагам найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны: «МТЗ», «Аграмаш», «Белшына», «Атлант», «МАЗ», «Амкадор», «БелАЗ». Дэлегаты ўжо зацікавіліся беларускімі трактарамі, самазваламі, аэрадромнай тэхнікай.**

Як адзначыў Хан Жатой, беларуская тэхніка вельмі папулярная ў Пакістане і збіраецца там ужо апошнія 30 гадоў. Паводле яго слоў, у супрацоўніцтва двух бакоў сёння ёсць усе перспектывы для дасягнення тавараабароту ў 1 млрд долараў, таму яго неабходна працягваць і ўмацоўваць. Акрамя таго, падкрэсліў міністр, дзякуючы будаўніцтву кітайска-пакістанскага калідора грузавая і будаўнічая тэхніка з Беларусі можа стаць яшчэ больш запатрабаванай. У перспектыве ў Пакістане стане магчымым збіраць прадукцыю не толькі для мясцовага рынку, але і для трэціх краін: з'явіцца выхад на рынкі Сярэдняга і Блізкага Усходу. Пасля стварэння кітайска-пакістанскага калідора з'явіцца выхад у Паўднёва-Усходнюю Азію і Афрыку.

Міністр прамысловасці і вытворчасцяў Пакістана таксама расказаў, што падчас візіту ўжо адбылася сустрэча з міністрам аховы здароўя Беларусі Васілём Жарко, дзе абмяркоўваліся супрацоўніцтва ў сферы фармацэўтыкі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Май на ўвазе

# ЭЛЕКТРАМАГНІТНЫЯ ПЕРАШКОДЫ

## Чаму свяцільнікі некаторых фірмаў забаранілі прадаваць

**Сёлета ўжо выдадзена чатыры прадпісанні аб забароне ўвозу і абарачэння на рынку рэспублікі нізкаэнергаэфектыўных і святлодыёдных свяцільнікаў кітайскай і расійскай вытворчасці па прычыне іх неадпаведнасці патрабаванням электрамагнітнай сумяшчальнасці, устаноўленых у тэхнічным рэгламенце Мытнага саюза «Электрамагнітная сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў».**

Так, па выніках выпрабаванняў асобных мадэляў свяцільнікаў гандлёвых марак «Нордкліфф», EKF, «Ксенан» устаноўлена, што электрамагнітныя перашкоды ад іх перавышалі дапушчальную норму больш як на 20%. У прэс-службе Дзяржстандарта адзначаюць, што выкарыстанне такіх прыбораў можа адмоўна адбіцца на функцыянаванні іншага абсталявання, падключанага да сеткі, пагоршыць якасць работы прыёмных і перадавальных прылад, кантрольна-вымяральнай апаратуры, прывесці да збою іх паказанняў, што ствараe рызыкі для жыцця і здароўя спажыўцоў.

«У свяцільніках гандлёвых марак EKF, «Ксенан» не забяспечваўся неабходны ўзровень абароны ад уздзеяння электрычнага току. Для ўнутранага мантажу гэтых мадэляў свяцільнікаў выкарыстоўваліся занадта тонкія правады. Матэрыял корпуса (патрона) быў у 2,5 раза менш устойлівы да нагрэву, чым гэта дапускаецца патрабаваннямі. Прымяненне такіх камплектуючых вырабаў і матэрыялаў небяспечнае ўзнікненнем пажаранебяспечных сітуацый пры перагрузках у сетцы, аварыйных рэжымах і адмовах», — падкрэслілі ў прэс-службе Дзяржстандарта.

Устаноўлена таксама, што свяцільнікі «Ксенан» не адпавядаюць патрабаванням бяспекі па стойкасці да ўзгарання і па абароне ад паражэння электрычным токам.

**Дар'я ШОЦІК.**


ООО «Центр эксперт-услуг» (Организатор аукциона) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

**ОДНОЭТАЖНОГО КИРПИЧНОГО ЗДАНИЯ ДИСПЕТЧЕРСКОЙ**
**(здания неустановленного назначения)**

с инвентарным номером 350/С-135708, общей площадью диспетчерской – 8,4 кв.м (составные части: мастерская площадью застройки – 66 кв.м, металлические ворота), расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Комсомольская, 3а, на земельном участке площадью 0,0111 га, предоставленном на праве аренды сроком по 07.04.2019 г.

**Начальная цена – 150 003 000 бел. рублей с НДС.**
**Шаг аукциона – 5% от начальной цены.**
**Задаток – 10 000 000 бел. рублей.**

*Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет 3012403517013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, МФО 153001749, УНП 491058984, получатель платежа ООО «Центр эксперт-услуг», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 19.04.2016 г.*

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация об Объекте аукциона размещены на сайте **standard.by.**

Переход права аренды на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5%, обязан: в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить затраты Продавца на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений и рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам, в случае повторного выставления объекта на торги и определяется на основании представленных Организатором аукциона документов; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объекта недвижимости (далее договор купли-продажи); произвести оплату в сроки, установленные договором купли-продажи; если в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект недвижимости, в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, произвести оплату за объект недвижимости.

Аукцион состоится **18 мая 2016 г. в 11.00** по адресу: 246028, г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 16 мая 2016 г. до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 0232 21 21 61, + 375 29 685 49 86.**
**E-mail: 6854986@standard.by.**

Standard.by



**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «КОБРИНСКИЙ РКБО»**

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена без НДС, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Капитальное строение (инв. №123/С-25219) – здание административное, пл. 375,7 $м^2$, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 124350100001001461, пл. 0,0921 га | 1 366 971 000 | 136 697 100 |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, ул. Замковая, 7 | | |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Кобринский РКБО» | | |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| Условия оплаты | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 | | |

**Аукцион состоится 20 мая 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация». Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 19 мая 2016 г. до 17.00.**



**ДОПОЛНЕНИЕ К ГОДОВОМУ ОТЧЕТУ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ**
**ОАО «Барановичский молочный комбинат»,**
размещенное в газете «Звязда» №58 (28168) от 30.03.2016 г.

**Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности**

4. Доля государства в уставном фонде эмитента – 10,69%, в том числе коммунальная (областная) – 10,69%

**5-6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Ед. изм. | За 2015 год | За 2014 год |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 1 607 | 1 607 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 22 | 22 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 1 585 | 1 585 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 1 504.36 | 6 316.17 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | млн руб. | 1 504.36 | 6 316.17 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 5 589.80 | 23 469.30 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | руб. | 5 589.80 | 23 469.30 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 1547.59 | 1 478.10 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

**7,8. Отдельные финансовые результаты**

| Показатель | Ед. изм. | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | млн руб. | 746 455 | 689 326 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | млн руб. | 715 531 | 608 020 |
| Прибыль (убыток) до налогооблажения, всего | млн руб. | 25 045 | 78 807 |
| в т.ч.: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | млн руб. | 30 924 | 81 306 |
| в т.ч.: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | млн руб. | -6 917 | -4 928 |
| в т.ч.: прибыль (убыток) от инвестиционной, финанасовой и иной деятельности | млн руб. | 1 038 | 2 429 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | млн руб. | 5 683 | 13 787 |
| Чистая прибыль (убыток) | млн руб. | 19 362 | 65 020 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | млн руб. | 192 744 | 175 806 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | млн руб. | | |
| Долгосрочные обязательства | млн руб. | 7 734 | 21 015 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 476 | 499 |

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: производство молока и молочных продуктов 710800 млн рублей (95.2%). В том числе сухие молочные продукты – 213753 млн. рублей (30%). Сыры и творог 198740 млн. рублей (28%).

12. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 28 марта 2016 г.

15. Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения: собрание акционеров утвердил: регламент работы общества 24.03.2010 г.; положение об аффилированных лицах 25.05.2008 г.

УНП 200167548

# ПРА КУЛЬТУРУ — АПТЫМАЛЬНА

**У Год культуры яе адчуць павінен кожны. Усвядоміць. Быць яе часткай. Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ на сустрэчы з журналістамі патлумачыў асобныя моманты існавання галіны. Найбольш цікавыя вытрымкі прапануем нашым чытачам.**



Фота Марыі ВОЙЦІК.

## Вяртанне каштоўнасцяў

— Пры Савеце Міністраў Беларусі існуе камісія па вяртанні каштоўнасцяў. Дзяржава робіць усё (у тым ліку Міністэрства культуры), каб прадумаць і стратэгію, і тактыку, як весці супрацоўніцтва з іншымі краінамі ў гэтым кірунку. Адзін з вынікаў 2015 года — стварэнне спіса тых каштоўнасцяў, якія знаходзяцца за межамі нашай краіны. Што тычыцца канкрэтных праектаў, то Міністэрства культуры заключыла дагавор з «Белгазпрамбанкам», які займаецца тэмай набыцця работ беларускіх мастакоў Парыжскай школы і вяртае іх сюды, а потым, выкарыстоўваючы выставачныя залы Нацыянальнага мастацкага музея, разам у партнёрстве з дзяржавай праводзіць выстаўкі. У нас набываюцца кнігі — рэдкія выданні — для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Мы знаходзім мецэнатаў, спонсараў, якія сябе нават не раскрываюць, і набываем тыя ці іншыя каштоўнасці, якімі мы павінны ганарыцца ў краіне. Я не сказаў бы, што кіруе ў гэтым працэсе прыватная ініцыятыва, але яна таксама патрэбна. Дзяржаўная палітыка ў гэтым пытанні накіравана на атрыманне выніку.

Ёсць праекты вяртання нашых каштоўнасцяў у віртуальным выглядзе. У сілу шэрагу прычын нават нашы партнёры не гатовы нам іх аддаваць. Гісторыя так распарадзілася, што не ўсё вярнуць магчыма, ды ёсць пытанні міжнароднага права. Дзеля таго, каб мець магчымасць дакранацца да гэтых каштоўнасцяў (асабліва што тычыцца кніг, рукапісаў), вядзецца вялікая праца па алічбоўцы і факсімільным выданні — Скарыны, бібліятэкі Храптовічаў, бібліятэкі Сапегаў. Такім чынам ёсць магчымасць зрабіць іх даступнымі шырокаму колу чытачоў.

## Помнікі — у добрыя рукі

— У Беларусі больш за 5000 аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны розных катэгорый. Ёсць шэраг аб'ектаў, па аднаўленні якіх мы гатовы супрацоўнічаць з прыватнымі інвестарамі; галоўнае, каб пры рэканструкцыі яны захавалі інтарэсы дзяржавы. Толькі ў Мінскай вобласці ёсць каля 40 сядзіб, якія могуць быць перададзены ў прыватныя рукі. Але пры гэтым новыя ўладальнікі павінны захоўваць інтарэсы дзяржавы і клапаціцца пра тое, каб аблічча помніка гісторыі адпавядала гістарычнаму і ўяўляла каштоўнасць. Але так бывае, што ўладальнікі сядзіб імкнуцца іх перарабіць ці прыстасаваць пад свае густы ці інтарэсы. Спяшаюцца з аднаўленчымі работамі, каб хутчэй атрымаць аддачу. Таму спрэчкі падчас рэканструкцый на гістарычных сядзібах нярэдкія: як і што робіцца, ці ў адпаведнасці з патрабаваннямі. Узнікалі пытанні і па аднаўленні замка ў Любчы і сядзібы ў Воранава. Але дзяржава скіраваная на супрацоўніцтва і аказвае метадычную і кансультацыйную дапамогу.

## Музейны квартал

— Пры ўсіх цяжкасцях фінансавання работы па стварэнні музейнага квартала пры Нацыянальным мастацкім музеі не спыняюцца. Цяпер ідзе рэканструкцыя двух памяшканняў: па вул. Кірава і вул. Маркса. Асноўнае, што трэба было зрабіць з пункту гледжання будаўніцтва, — накрыць дах, каб перайсці да ўнутраных работ. Трэба з'яднаць стары будынак з новымі, якія ўводзяцца ў абарачэнне; патрэбны галерэі, таму нешта яшчэ дабудоўваецца. Функцыі ў гэтых будынкаў будуць розныя: захаванне каштоўнасцяў, дэманстрацыйная зала. Сёлета мы атрымалі шмат заявак на тое, каб папрацаваць у Нацыянальным мастацкім музеі падчас суботніка (шэраг арганізацый выбіраюць культурныя а'бекты). Нягледзячы ні на якія цяжкасці (эканоміцы цяпер няпроста), работы ідуць, і калі ўсё будзе добра, то праз тры гады мы будзем мець новы музейны квартал.

## Рэканструкцыя кінастудыі

— Рэканструкцыя «Беларусьфільма» павінна была скончыцца яшчэ ў 2012 годзе, 31 снежня. Але цяпер вызначаны новы тэрмін: 31 снежня 2016 года. Паколькі ўсё залежыць ад фінансавання, то завяршэнне рэканструкцыі зноў пераносіцца на наступны год. Калі ёсць грошы, то работы актывізуюцца. Фінансаванне змяншаецца — крыху сціхаюць. Можна было б гаварыць пра тое, што нашы будаўнікі гатовыя ўвесь час працаваць. Летась яны напрацавалі так на 20 мільярдаў рублёў. Сёлета таксама ўжо ўвесь час працуюць, але таму, што трэба завяршыць цыкл работ. Гэта вымушаны, але не найлепшы варыянт: ёсць заканадаўства, якое рэгулюе гэтыя адносіны і прадугледжвае санкцыі. Прыходзіцца знаходзіць магчымасці, каб будаўнічае жыццё на кінастудыі не сціхала, каб рэканструкцыя працягвалася. Але што да гэтага праекта, то наогул шмат пытанняў, «навошта» і «чаму».

## Творчыя работнікі

— У краіне існуюць творчыя саюзы, але раз-пораз узнікаюць пытанні: дапамажыце творчаму саюзу, не хапае грошай на існаванне. Можна на гэта грошы знайсці, але пытанне: а чым вы дапаможаце дзяржаве? У нас было пытанне наконт таго, каб творцы не траплялі пад закон аб дармаедах. Каму, як не творчаму саюзу, лепей ведаць, ці ўяўляе гэты чалавек сабой творчую асобу, ці займаецца творчасцю? Вызначаць гэта — не функцыя міністэрства. Я лічу, што галоўная задача нашых творчых саюзаў заключаецца ў тым, каб яны выконвалі сваю ролю вызначэння мастацкага ўзроўню творчых з'яў у нашым грамадстве: гэта і рэдактура, і крытыка, і шмат што іншае. Сёння яны саступілі ўбок, і ўсё ўзяло на сябе міністэрства. Так, у нас працуюць кваліфікаваныя спецыялісты, якія могуць ацаніць любы твор мастацтва. Але ці наша гэта задача? Міністэрства павінна вызначаць стратэгію развіцця галіны. Ёсць канкрэтныя пытанні, над якімі могуць працаваць асобныя ўстановы, рэгіянальныя ўлады, тыя ж творчыя саюзы.

## Ацэнка працы

— Незалежна ад таго, Год культуры ці не, але мы рабілі спробы пераглядзець сітуацыю з заробкамі ў сферы культуры. І будзем рабіць гэта пастаянна і пасля заканчэння гэтага года. Калі казаць пра такія спадзяванні, то трэба мець на ўвазе не толькі выдаткаваныя з дзяржбюджэту сродкі, колькі магчымасць зарабляць самім і такім чынам павышаць заработную плату. Цяпер на слыху слова «аптымізацыя», але не ўсе разумеюць, што гэта такое. Гэта тыя працэсы, якія ў тым ліку павінны прывесці і да павышэння заработнай платы. Ці стварыць умовы для таго, каб установы культуры маглі зарабіць іх самі.

**Запісала Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Вернісаж

# НЕ СУЗІРАННЕ, А ПОШУК СЭНСАЎ

## Унікальная выстаўка сучасных аўтараў адкрылася ў Мінску

**Пірсінг для «Венеры Урбінскай» Тыцыяна — гэта нешта новае. У Цэнтры сучасных мастацтваў адкрылася выстаўка «Усё было па-іншаму», якая рыхтавалася на працягу года. Аўтары, якія зараз жывуць і працуюць у Беларусі, Бельгіі і Польшчы, спецыяльна для праекта падрыхтавалі дванаццаць работ — інсталяцый, фотаздымкаў, аб'ектаў, што хаваюць свае сэнсы ў самой форме і патрабуюць ад наведвальніка апроч разумовай працы фізічнага ўдзелу. Перасыпаць з рукі ў руку пясок, дакрануцца да вады, зняць з вешалкі архіўныя фотаздымкі — усё можна. У тым ліку — убачыць агульны вобраз сучаснага беларускага мастацтва і яго формы.**



Выраз «Усё было па-іншаму» як назва экспазіцыі — ці то настальгічная, ці то самаўпэўненая канстатацыя, якая ўмацоўвае на належным месцы тое самае шматграннае і непаўторнае contemporary art. Яго абрысы, тэмы і тэндэнцыі, што адрозніваюць сёння ад учора, учора ад пазаўчора. А яшчэ гэта канцэпцыя работ, якія ставяць пад сумнеў надзейнасць такіх, здавалася б, дакладных рэчаў, як дакумент, выява, тэкст, і іх адпаведнасць нашай памяці, здольнай трансфармаваць успаміны.

Гіпнатычныя сюжэты роўд-муві з гульнёй слоў «ты — гэта толькі ты» альбо «толькі ты ёсць», прасторавая інсталяцыя з архіўнымі фотаздымкамі на пашпарт сярэдзіны 1990-х гадоў, пясочніца з відэа, на якім бясконца «выцякае» пясок. У гэтых залах і на гэтых сценах шмат вольнай прасторы, паветра, свабоды. У адным памяшканні змяшчаецца альбо асобны праект, альбо два, якія перагукаюцца між сабой. Вы прыйдзеце сюды не сузіраць, а думаць і рэфлексаваць. Ад аб'екта да аб'екта, ад залы да залы. Для гэтага трэба больш часу: загадкі работ выклікаюць пэўны азарт. Жаданне высветліць, патлумачыць, раскрыць. І трэба быць гатовым да таго, што тлумачэнняў можа быць шмат, а эксплікацыі даюць толькі адзін варыянт, а ў гледача можа быць шэраг сваіх, асабістых.

У адной зале вы знаходзіце закуток, у якім на падлозе вада, зверху нябачная крыніца святла, а на вадзе адлюстроўваецца слова. «Рэвалюцыя». Канстанцін Селіханаў у сваёй інсталяцыі неонавым надпісам ставіць пытанне аб значэнні слоў, аб тым, як мы іх успрымаем і надаём розныя адценні. Чырвоная рэвалюцыя, ружовая альбо зялёная — ад колеру залежыць сэнс. Больш за тое, якое значэнне мае слова, адлюстраванае ў вадзе, якая можа пайсці рабізной, утварыць хвалю і люстэрка размыецца? Работа называецца «Прывід святога Аўгусціна», што адсылае да легенды, у якой Аўгусцін заўважыў на беразе мора дзіця, якое чэрпала ваду лыжкай. Немагчымасць вычарпаць мора як немагчымасць ахапіць розумам неахопнае. Сэнсы. (У тым ліку, магчыма, сэнс гэтай інсталяцыі.)

«У фокусе нашай увагі аказаліся тыя жыццёвыя сітуацыі, калі мы не зусім разумеем, што насамрэч адбываецца, — расказвае куратар выстаўкі Таццяна Кандрацёнка. — Мы кажам, што словам, падзеям, выявам, дакументам нельга верыць, яны нас падманваюць. Калі гаварыць больш шырока, культура — гэта зона стварэння сэнсаў, і на гэтай выстаўцы мастакі змагаюцца за тое, каб ствараць уласныя сэнсы, прыцягваць да іх увагу, адстойваць свае пазіцыі. Гэты праект можна ахарактарызаваць як зону барацьбы. Гэта абсалютна розныя мастакі з розных краін, розных пакаленняў — некаму 35, а некаму каля 60. Калі дарэчы так казаць, і розных статусаў — тут прадстаўлены знакавыя на сусветнай мастацкай сцэне аўтары, альбо тыя, хто выстаўляецца ў Мінску ўпершыню. Агульнае выказванне гэтага праекта вырасла з нашай гадовай працы неяк само сабой. Мастакі працавалі над акрэсленай тэмай, мы сустракаліся, спрачаліся, цярпелі складанасці і рознагалоссі. У выніку атрымалася тое, што мы можам убачыць».

У асобнай зале размешчана серыя з дзевяці фотаздымкаў Аляксандра Цэхановіча пад назвай «Касмадромы знікаюць». За іранічнай назвай стаяць характэрныя архітэктурныя формы пабудоў, што некалі належалі калгасам і саўгасам. Гэта закінутыя свірны, збожжасховішчы, сушылкі, памяшканні для жывёл, да якіх аўтар прыглядаўся з дзяцінства. «Яны мне нагадвалі амерыканскі жывапіс 1950-х гадоў, прадстаўніком якога з'яўляецца Эдвард Хопер, — кажа Аляксандр Цэхановіч. — У ЗША ёсць падобныя будынкі з такімі ж функцыямі, толькі яны яшчэ больш грувасткія і складаныя. У дзяцінстве, калі я пачаў цікавіцца мастацтвам і жывапісам, стаў заўважаць гэтыя будынкі на палях з маляўнічымі гарызонтамі. У першую чаргу мяне зацікавілі іх формы. Яны ўсе розныя. Многія з гэтых пабудоў ужо не існуюць: калі я прыязджаю ў Беларусь, бачу, як усё змяняецца, нешта знікае». Гэтая зала паказвае прыгажосць у тым, дзе яе не чакалі, у самай пабытавай, самай звычайнай і непрыкметнай для нашага «замыленага» вока вяве.

Характэрны беларускі кантэкст адбіваецца не толькі на праекце «Касмадромы знікаюць», а таксама на работах Ігара Цішына, які прадставіў жывапіс па фатаграфіі, у інсталяцыі Антаніны Слабодчыкавай «Поўнае маўчанне» (назва адсылае да выказвання рэжысёра П'ера Пола Пазаліні: «Самая чыстая форма мастацтва — поўнае маўчанне паэтаў, якія не пішуць»).

Яшчэ адным аб'ектам сучаснага мастацтва, прадстаўленым на выстаўцы, з'яўляецца гук, дакладней, гукавая інсталяцыя «Маша» Ігара Саўчанкі. Цёмнае памяшканне, у якім на месцы жывапісных альбо фатаграфічных работ — пустэча, затое гучыць песнапенне роўным голасам — адным і тым жа — сентыментальных, растыражаваных, усім вядомых песенек (хронаметражом амаль сорак хвілін). Вы застаяцеся ў даволі інтымнай атмасферы і слухаеце «мэйнстрымавую» музыку, чым Ігар Саўчанка змешвае патаемнае і агульнадаступнае. «Экспазіцыйнае рашэнне аўтара было ў тым, каб пакінуць як бы кінуты пакой, недаробленым, нядбайны. Дзе гучыць васямнаццаць невыносных песень: рамансаў, саўндтрэкаў да кінафільмаў, эстраднай музыкі — усё, што можна было пачуць у 1980-1990-я гады. Тут падабраны песні, якія нешта кажуць пра лёс чалавека, пра дзяцінства, сяброўства, расстанне, настальгію, саперніцтва. Ключавым момантам з'яўляецца нейтральнае песнапенне растыражаваных песень, якое дзіўным чынам усё роўна западае ў душу, таму што кажа пра тое, што тычыцца ўсіх нас», — каментуе Таццяна Кандрацёнка.

Выстаўка «Усё было па-іншаму», падрыхтаваная Цэнтрам сучасных мастацтваў і фондам «Ідэя» пры падтрымцы кампаніі Velcom, доўжыцца да 14 мая.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

АБСОЛЮТБАНК

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 г.

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 6 | 89 844 | 15 222 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 7 | 27 980 | 56 409 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 8 | 292 241 | 244 711 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 9 | 3 205 | 3 205 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 10 | 453 138 | 152 163 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 11 | - | 5 160 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 12 | 1 | 1 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 13 | 54 539 | 46 597 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 14 | 29 359 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 15 | 69 721 | 17 205 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 1 020 028 | 540 673 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 16 | 5 | 3 157 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 17 | 79 177 | 7 999 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 18 | 439 583 | 143 815 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 19 | 25 661 | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 20 | 8 823 | 4 984 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 553 249 | 159 955 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 21 | 373 306 | 353 555 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 22 | - | 3 514 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 23 | 29 886 | 28 538 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 24 | 63 587 | (4 889) |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 466 779 | 380 718 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 020 028 | 540 673 |

Форма 2

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 2015 год

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 26 | 142 870 | 60 765 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 26 | 27 260 | 33 008 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 26 | 115 610 | 27 757 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 27 | 10 738 | 23 928 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 27 | 2 118 | 1 171 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 27 | 8 620 | 22 757 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 28 | (304) | (617) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 29 | 40 063 | 17 679 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 30 | 800 | 650 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 31 | (1 398) | 21 966 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 32 | 9 146 | 6 383 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 33 | 82 924 | 62 060 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 34 | 9 179 | 595 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 83 230 | (10 012) |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 35 | 18 454 | 932 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 64 776 | (10 944) |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 36 | 4 | (3) |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | 36 | - | - |

Форма 3

## ОТЧЕТ об изменении собственного капитала за 2015 год

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2014 г. | 3011 | 63 306 | - | 3 504 | 5 877 | 21 338 | 94 025 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменения учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 290 249 | - | 10 | (10 766) | 7 200 | 286 693 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | (10 944) | 7 388 | (3 556) |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | - | - | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 290 249 | - | x | - | x | 290 249 |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 290 249 | - | x | x | x | 290 249 |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | 10 | 178 | (188) | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3013 | 353 555 | - | 3 514 | (4 889) | 28 538 | 380 718 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2015 г. | 3011 | 353 555 | - | 3 514 | (4 889) | 28 538 | 380 718 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 19 751 | - | (3 514) | 68 476 | 1 348 | 86 061 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 64 776 | 1 534 | 66 310 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | - | - | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 19 751 | - | x | - | x | 19 751 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 19 751 | - | x | x | x | 19 751 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | (3 514) | 3 700 | (186) | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3013 | 373 306 | - | - | 63 587 | 29 886 | 466 779 |

Приложение к отчету об изменении собственного капитала

## СВЕДЕНИЯ о совокупном доходе за 2015 год

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 64 776 | (10 944) |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 1 534 | 7 388 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | | 1 534 | 7 388 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 66 310 | (3 556) |

Форма 4

## ОТЧЕТ о движении денежных средств за 2015 год

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 г. | 2014 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 131 362 | 59 948 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (25 543) | (33 049) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 10 937 | 23 231 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (2 001) | (1 149) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (304) | (617) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 27 319 | 7 623 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 7 044 | 6 042 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (78 039) | (58 510) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (19 245) | (1 531) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 51 530 | 1 988 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | 17 755 | (125) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | 187 724 | (232 809) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | - | - |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (293 846) | 41 312 |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (39 117) | (602) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (127 484) | (192 224) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | (3 006) | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 53 790 | (36 273) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 263 729 | (91 784) |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 24 120 | - |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (2 493) | (5 815) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 336 140 | (133 872) |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | 260 186 | (324 108) |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (8 248) | (2 143) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 174 | 45 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | (369 282) | (135 000) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 369 282 | 135 000 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (8 074) | (2 098) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 19 751 | 290 249 |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 19 751 | 290 249 |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 23 557 | 2 979 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 295 420 | (32 978) |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 38 | x | 61 680 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 38 | 357 100 | x |

Руководитель В.И.Вашкевич

Главный бухгалтер О.С.Турбина

Дата подписания 9 февраля 2016 г.

**Бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» за 2015 год в полном объеме размещена на сайте www.absolutbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №9 от 24.06.2015. УНП 100331707

---

BDO

Телефон: +375 17 308 74 50
Факс: + 375 17 308 74 51
www.bdo.by

ООО «БДО»
пр. Победителей, 103
Офис 807
Минск, Беларусь
220020

Исх. номер: 04-03/38-1/164/1

**Аудиторское заключение по годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Закрытого акционерного общества «АБСОЛЮТБАНК» за 2015 год**

Акционерам, Наблюдательному совету и Правлению ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»
Национальному банку Республики Беларусь

**Аудиторская организация**
**Наименование:** Общество с ограниченной ответственностью «БДО» (сокращенное наименование - ООО «БДО»)
**Место нахождения:** Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр. Победителей, 103, офис 807
**Сведения о государственной регистрации:** Свидетельство о государственной регистрации
выдано на основании решения Минского городского исполнительного комитета от 15.11.2013 за № 0087747
УНП: 190241132

**Аудируемое лицо**
Наименование: Закрытое акционерное общество «АБСОЛЮТБАНК» (сокращенное наименование банка - ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»);
**Место нахождения:** Республика Беларусь, 220023, г. Минск, проспект Независимости, 95.
**Сведения о государственной регистрации:** Закрытое акционерное общество «АБСОЛЮТБАНК» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 29 декабря 1993 года, регистрационный номер 34.
УНП 100331707

***Заключение по годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности***

Мы провели аудит прилагаемой годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Закрытого акционерного общества «АБСОЛЮТБАНК» (далее – Банк), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2016 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала и отчета о движении денежных средств за 2015 год, а также примечаний к годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.

***Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности***

Ответственность за подготовку и объективное представление годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь несет руководство Банка. Ответственность руководства Банка заключается в разработке, внедрении и поддержании системы внутреннего контроля, относящейся к подготовке и объективному представлению годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой; а также в выборе и применении соответствующей учетной политики и определении оценочных значений, адекватных текущим обстоятельствам.

***Обязанности аудиторской организации***

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ЗАО «АБСОЛЮТБАНК», необходимая для составления годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК».

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

***Аудиторское мнение***

По нашему мнению, годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» на 1 января 2016 года, а также финансовые результаты деятельности и изменения его финансового положения (движение денежных средств) за 2015 год в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

***Заключение по отдельным проверяемым вопросам***

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности», составленные Банком и представляемые на 1 января 2016 года. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство Банка. В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, вышеназванные формы пруденциальной отчетности на 1 января 2016 года составлены ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» достоверно во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 (с учетом дополнений и изменений).

Директор
Управляющий партнер
BDO в Беларуси

А.Н. Шкодин
(квалификационный аттестат аудитора № 0000657 от 10 марта 2003 года, рег. № 650)

Заместитель
директора
по аудиту

Д.А. Бекешко
(свидетельство о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе № 71 от 03.10.2013, Квалификационный аттестат аудитора № 0002114 от 27.06.2013 г., рег.№ 1935)

Дата аудиторского заключения: 18 марта 2016 года
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 18 марта 2016 года

Председатель Правления Вашкевич В.И. Подпись______________

■ Прававая гасцёўня

# НАТАРЫУС ПРЫЕДЗЕ, КУДЫ ЗАПРОСЯЦЬ...

## Але ў межах пэўнай акругі і за дадатковую плату



**На пытанні адказвае Алена МІРОШНІКАВА, галоўны спецыяліст упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.**

***Мой бацька пасля аперацыі ляжачы хворы. Ці магу я выклікаць дахаты натарыуса, каб аформіць даверанасць на атрыманне пенсіі ў паштовым аддзяленні? І ці з'яўляецца абавязковым натарыяльнае засведчанне такой даверанасці?***

**Вера Іванаўна**, *г. Мінск.*

Безумоўна, вы можаце выклікаць натарыуса дадому. Згодна з пунктам 3 артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» ад 18 ліпеня 2004 г., натарыусам дазваляецца здзяйсняць натарыяльныя дзеянні за межамі натарыяльнай канторы (бюро). А грамадзянін або прадстаўнік юрыдычнай асобы, які не можа з'явіцца ў натарыяльную кантору, мае права выклікаць натарыуса або ўпаўнаважаную службовую асобу па месцы свайго знаходжання. Парадак такога выезду рэгламентаваны пунктам 10 Інструкцыі аб парадку здзяйснення натарыяльных дзеянняў, зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 23.10.2006 г. № 63 (Інструкцыя).

Запрасіць натарыуса можна не толькі дадому, але і на працу, у бальніцу, аграгарадок і іншыя месцы, шэраг якіх акрэслены Мінюстам. Заказчык павінен пакрыць фактычныя транспартныя расходы спецыяліста на дарогу. Другі варыянт — дастаўка натарыуса чалавекам, які выклікаў спецыяліста, да месца ажыццяўлення натарыяльнага дзеяння і яго вяртанне на службу.

Кошт выкліку спецыяліста абумоўлены ў Натарыяльных тарыфах за здзяйсненне натарыяльных дзеянняў і аказанне паслуг прававога і тэхнічнага характару натарыусамі і тарыфах на паслугі тэхнічнага характару, якія аказваюць работнікі натарыяльных архіваў. Гэты дакумент зацверджаны Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2013 г. № 1145.

Згодна з пунктам 50 гэтага дакумента, выезд натарыуса абыдзецца ў адну базавую велічыню фізічным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам (ІП).

Калі выезд натарыуса патрэбен, каб сабраць пакет дакументаў для выканання працэдуры, зацікаўленая фізічная асоба або ІП мусіць выплаціць (згодна з пунктам 51 Тарыфаў) палову базавай велічыні, юрыдычныя асобы і органы кіравання юрыдычнымі асобамі — адну базавую.

Пунктам 3 Пастановы № 1145 для асобных катэгорый грамадзян прадугледжаны шэраг ільгот на аплату натарыяльнага тарыфу. Акрамя таго, пункт 4 гэтага ж дакумента надзяляе Беларускую натарыяльную палату, абласныя і Мінскую гарадскую натарыяльныя палаты правам часткова або цалкам пазбавіць ад аплаты тарыфу і іншых асоб, для якіх такія льготы не прадугледжаны.

Даверанасць на атрыманне пенсіі не абавязкова завяраць натарыяльна. Згодна з пунктам 4 артыкула 186 Грамадзянскага кодэкса, не патрэбна натарыяльна завераная даверанасць на атрыманне заробку і іншых плацяжоў, звязаных з працоўнымі адносінамі; узнагароджанняў аўтараў і вынаходнікаў, пенсій, дапамог і стыпендый; выплат грамадзянам у банках або нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях і на атрыманне карэспандэнцыі, у тым ліку грашовай і пасылачнай, і некаторых іншых дзеянняў. Дакумент на атрыманне перанічаных выплат іншай асобай можа засведчыць арганізацыя, у якой працуе ці вучыцца давернік, або якая займаецца эксплуатацыяй жыллёвага фонду і (ці) ажыццяўляе жыллёва-камунальныя паслугі па месцы яго жыхарства.

***Я — інвалід з парушэннем функцый апорна-рухальнага апарата. Калі мяне прывязуць да натарыяльнай канторы на машыне, ці зможа натарыус завяраць паперы на вуліцы?***

**Аркадзь Васілевіч**, *г. Брэст.*

Калі чалавек даехаў да натарыяльнай канторы (бюро), аднак праз пэўныя фізічныя недахопы яму цяжка ўвайсці ў будынак, згодна з часткай 2 пункта 2 Інструкцыі, натарыус мае права выйсці да грамадзяніна. Спецыяліст можа высветліць яго намеры адносна натарыяльных працэдур, растлумачыць правы і абавязкі, папярэдзіць аб наступствах дзеянняў, якія здзяйсняе чалавек, падпісаць натарыяльны дакумент, распісацца ў рээстры для рэгістрацыі натарыяльных дзеянняў у атрыманні натарыяльна аформленага дакумента. Усе гэтыя працэдуры будуць лічыцца здзейсненымі ў натарыяльнай канторы.

***Мой муж быў у камандзіроўцы ў Расіі, трапіў там у ДТЗ і цяпер знаходзіцца ў бальніцы ў Смаленску. Ці магу я выклікаць да яго натарыуса з Оршы, каб заверыць даверанасць на распараджэнне машынай?***

**Наталля Калач**, *г. Орша.*

— Выклікаць натарыуса за межы Беларусі немагчыма. Згодна з пунктам 2 артыкула 16 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» ад 18 ліпеня 2004 г., натарыус можа ажыццяўляць дзейнасць толькі ў межах пэўнай натарыяльнай акругі, дзе ён надзелены прафесійнымі паўнамоцтвамі. У рамкі такой акругі ўваходзяць адна або некалькі адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак тэрыторыі Беларусі.

**Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы** ■

■ Камандзіроўка па пісьме

# КАМУ БАЛЯЦЬ ЧУЖЫЯ НОГІ?

**85-гадовы жыхар вёскі Балашэвічы Глускага раёна расказаў пра тое, як яму цяжка дабірацца да бальніцы ў райцэнтр.**

**Ліст у рэдакцыю ад Уладзіміра Дзядзюлі, інваліда 2 групы, можна назваць крыкам душы. Ён піша, што да аўтобуснага прыпынку ад яго дома ісці кіламетр, а ў яго хворыя ногі. І гэта ператварае яго паездкі ў бальніцу на ўколы ў цяжкі іспыт. Летась ён стаў пісаць у розныя інстанцыі, каб прыпынак грамадскага транспарту перанеслі бліжэй да месца яго пражывання, а яшчэ лепш — пусцілі аўтобус па вуліцы, дзе ён жыве. «Аднак мяне і слухаць не хочуць, — паскардзіўся чытач. — Адна надзея на вас».**



Старшыня Казловіцкага сельсавета Уладзімір Каблаш рад бы дапамагчы, але не ведае, як?

## Прыпынак па патрабаванні

Сітуацыя насамрэч тупіковая. Праблему Уладзіміра Дзядзюлі ў райвыканкаме ведаюць добра. Апошнім часам перапіска з ім вядзецца вельмі актыўна. Толькі, тлумачаць там, заяўнік вельмі патрабавальны. Маўляў, на ўсю вёску Балашэвічы толькі яму патрэбны гэты заезд. Тое, што магчымасці зрабіць так, як ён хоча, няма, стары ігнаруе. Згодны толькі на адзін варыянт: аўтобус павінен даязджаць да яго дома.

Раённыя ўлады запэўніваюць: прыпынак перанесці нельга, як і накіраваць аўтобус наўпрост праз вуліцу, дзе жыве дзед. Аўтобусу прыйдзецца ехаць па нядобраўпарадкаванай лясной дарозе, дзе калдобіны і пясок. Рабіць там праезд дзеля аднаго чалавека, справа не танная. Дзе ўзяць на гэта сродкі? Лішніх у бюджэце няма.

Разам з начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глускага райвыканкама Наталляй Гулевіч і старшынёй Казловіцкага сельсавета Уладзімірам Каблашам едзем да заяўніка ў госці. Трэба ж неяк знайсці кампраміс.

Уладзімір Дзядзюля падпісчык нашай газеты з 50-гадовым стажам. Першае, што кідаецца ў вочы на стале ў хаце, менавіта «Звязда». А на сцяне пачэснае месца побач з вясельным партрэтам нашага чытача і яго жонкі Матроны Пятроўны займае каляндар «Звязды». Жонкі ўжо другі год як няма. Яе адыход вельмі падкасіў здароўе гаспадара.

— Раней ног не адчуваў, працаваў па-чорнаму. Коней трымаў, кароў, авечак, індыкоў. Сваімі рукамі гэты дом перабудаваў, печ сам клаў, рабіў вокны, дзверы. А зараз здароўя няма нават да ўрачоў дабрацца, — горка ўздыхае суразмоўца.

Пакуль былі сілы перасоўвацца, Уладзімір Дзядзюля сваім становішчам не злоўжываў. Уся вёска дзівілася, як ён адной нагой (другая трымалася нерухома) круціў педаль веласіпеда і ехаў. Але цяпер такая эквілібрыстыка яму ўжо не па сілах.

У вёсцы ёсць ФАП, але хворыя ногі не дазваляюць ім задаволіцца. Патрабуецца асобае лячэнне.

— Сёння хаджу, усё нармальна, а потым, як скруціць ногі, толькі і ратунку, што ва ўрачоў, — кажа ён. — Хірург робіць уколы ў калена сам, фельчар не ўпаўнаважаны. А які ўкол патрэбны не адзін. І ў горад прыходзіцца ездзіць некалькі разоў запар. Дзякуй, што ўрач яшчэ ідзе насустрач, адразу некалькі рэцэптаў выпісвае. Там ведаюць маё становішча. Раяць, калі што, выклікайце хуткую дапамогу. А які мне ад гэтага толк? Мне ўрач патрэбны канкрэтны.

У паліклініцы Дзядзюля часцей за ўсё наведвае трох урачоў: хірурга, тэрапеўта, акуліста. Адно вока слаба бачыць, кажа, што на ім катаракта. Але больш за ўсё турбуюць усё ж такі ногі.

Па словах загадчыка Глускай райпаліклінікі Андрэя Дзядзюлі (я спачатку вырашыла — сваякі, але, як высветлілася, на Глусчыне шмат хто з такім прозвішчам), для падтрымальнага лячэння Уладзіміру Аляксеевічу дастаткова наведваць паліклініку 1 раз у месяц. А льготныя рэцэпты для хранічных пацыентаў, калі не патрабуецца больш частае іх назіранне, ёсць магчымасць выпісваць адразу на 2-3 і нават 6 месяцаў. Ёсць таксама такая форма, як дамашні стацыянар. Гэта калі пацыента аглядае ўрач, назначае лячэнне і хворага перыядычна наведваюць участковая медыцынская сястра або фельчар ФАПа. На той выпадак, калі патрабуецца выкананне больш складаных медыцынскіх маніпуляцый або абвастрылася хранічнае захворванне, лячэнне можна прайсці ў стацыянары.



## У паліклініку за 100 тысяч

Нельга сказаць, што праблему ў раёне не спрабавалі рашаць. Усё ж такі чалавек сталага ўзросту, з балячкамі. Ды і адлегласць не вялікая — усяго 7 кіламетраў ад вёскі да горада. Спачатку дырэктар мясцовага аўтапарка пагадзіўся вазіць кліента. Нават бясплатна. Прапанаваў: калі трэба будзе ў бальніцу, звані. Але, калі дзед за кароткі час яму некалькі разоў патэлефанаваў, пачаў пазбягаць назойлівага просьбіта. Асабістым кіроўцам быць не дамаўляліся.

Тады пенсіянер звярнуўся да аднавяскоўцаў. Заплаціў аднаму за праезд 50 тысяч рублёў, а наступным разам ахвотных падвезці яго не знайшлося. Адлегласць у 7 кіламетраў можа і не вялікая, але некалькі разоў туды і назад праездзь, ды яшчэ падзяжур каля бальніцы, ніякіх грошай не захочаш.

Уладзіміру Аляксеевічу нават крыўдна за землякоў. Успамінае, што калі ў яго была машына, нікому не адмаўляў. Нават мог кінуць свае справы па гаспадарцы і завезці чалавека, куды трэба. Зараз ніхто за проста так і дзякуй не скажа, уздыхае ён. Сацслужба прапанавала скарыстацца паслугамі па льготных расцэнках. Па іх кожны кіламетр дарогі абыдзецца пенсіянеру ў 1800 рублёў, а гадзіна карыстання аўто — 27 тысяч.

— Дастаўка кліента ад дома да бальніцы і назад з улікам знаходжання непасрэдна ва ўстанове, напрыклад 2 гадзіны, будзе каштаваць прыкладна 100 тысяч рублёў, — падсумавала **дырэктар Глускага райцэнтра сацабслугоўвання Анжэла ПАЛУПАНКОВА.**

Дзед жа пры агучванні такой сумы маўчыць. На аўтобусе ён, як інвалід 2-й групы, можа ездзіць бясплатна. Чаму тут такія расцэнкі?

— Калі б пенсія грамадзяніна была ніжэй за пражытковы мінімум, мы б разглядалі пытанне аб выдзяленні яму адраснай дапамогі або бясплатнай дастаўцы, — патлумачыла Анжэла Мікалаеўна. — Але ж гэты чалавек атрымлівае добрую пенсію і можа сабе дазволіць скарыстацца нашымі платнымі паслугамі.

Цяпер пенсіянер спрабуе прапрацаваць яшчэ адзін варыянт. А што калі побач з яго домам зрабіць разваротнае кальцо? Там якраз нядаўна пляцоўка вызвалілася — дом знеслі. Што, калі аўтобус адхіліцца на кіламетр убок, забярэ тутэйшых жыхароў і зноў вернецца на маршрут?

— Сацыяльныя стандарты прадугледжваюць зону абслугоўвання ад прыпынку на адлегласці да 3 кіламетраў, — не згодны з такім варыянтам дырэктар Глускага аўтапарка Аляксандр Сыцько. — Вунь жыхары вёскі Байлюкі, ад якой да прыпынку наогул 2,7 кіламетра, і тое не абураюцца. Садзяцца ў вёсцы Клетнае і едуць куды трэба. Аўтобус ідзе праз 12 вёсак, але мы не павінны спецыяльна заязджаць за кожным пасажырам. Які нам сэнс рабіць бескарысны крук па вёсцы? Трэба разумець, што кожны лішні кіламетр адбіваецца на агульным кошце паездкі. Вы лепш спытайцеся ў людзей, ці згодны яны плаціць за гэты кіламетр?

## А што сабе думаюць дзеці?

Згодна з артыкулам №100 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, менавіта дзеці павінны даглядаць сваіх непрацаздольных бацькоў. У вёсцы жыве родны сын Уладзіміра Аляксеевіча і ўнучкі, адна з якіх нават сама ўжо маці. На дзяцей дзед не скардзіцца: яны і ў краму сходзяць, і ў хаце прыбяруць. Але, па сутнасці, чый, як не іх клопат хворага бацьку і дзеда даставіць да ўрачоў? Сваёй машыны ў сям'і няма, але ж можна папытаць у іншых.

Сяргей Дзядзюля, сын Уладзіміра Аляксеевіча, працуе ў Глускай ПМК №249. Шчыра прызнаецца, што да кіраўніка з падобнымі пытаннямі ніколі не звяртаўся. «Чым мне тут могуць дапамагчы?» — не разумее ён. Што датычыць іншых варыянтаў, то, як ён кажа, спрабаваў і да сваякоў падыходзіць, і да знаёмых. Але кожны заняты сваімі справамі, унікаць у праблемы іншых часу няма.

Калі я параіла Сяргею пагутарыць з бацькам наконт дома састарэлых, ён нават абурыўся. Пакуль я жывы, майго бацькі там не будзе, катэгарычна заявіў ён. Замкнёнае кола атрымліваецца. У раёне шмат старых людзей, у якіх таксама хапае балячак. І не ў кожнага аўтобусны прыпынак пад вокнамі. Але дзеда па-чалавечы шкада. Бо яму здаецца, што ўсе супраць яго. Таму, напэўна, і гучаць дагэтуль у вушах яго горкія словы: «Каму баляць чужыя ногі?»

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

*zigulya@zviazda.by* ■

# ГРОШЫ НЕ ДЛЯ ПАРТМАНЕТА



## Што за вітамін такі — віртуальны біткойн

**Сёння, калі электроннымі грашыма ўжо нікога не здзівіш, а плацяжы праз інтэрнэт праводзіць кожны другі, усё часцей гучыць тэрмін «крыптавалюта». Што гэта такое? Паспрабуем разабрацца.**

**Крыптавалюты — самая гучная інавацыя фінансавага свету за апошнія гады. Лічбавыя валюты, якія створаны і кіруюцца з дапамогай сучасных метадаў шыфравання (крыптаграфіі), прасунуліся ад чыста акадэмічнага паняцця да рэчаіснасці ў 2009 годзе са з'яўленнем флагмана крыптавалютнага свету валюты «біткойн» (bitcoin, ад спалучэння англійскіх слоў «bit» — мінімальная адзінка інфармацыі і «coin» — манета). Дакладней, канцэпцыя валюты была апублікавана 31 кастрычніка 2008 года таямнічымі распрацоўшчыкамі, якія выкарыстоўвалі псеўданім Сатошы Накамота (прычым да гэтага часу невядома, гэта быў адзін праграміст ці група асоб), а ўжо ў студзені 2009 года з'явіўся праграмны код.**

### Як гэта зроблена



Біткойн (BTC) — гэта і лічбавая валюта, і аднachасова сусветная плацежная сістэма, не прывязаная ні да якіх фізічных актываў. Біткойны ствараюцца з дапамогай майнінгу — рашэння нейкай складанай крыптазадачы метадам поўнага перабору. Звычайны «хатні» камп'ютар з гэтым не справіцца, таму майнеры крыптавалют выкарыстоўваюць звышпрадукцыйныя ПК або магутныя серверы. Кожная лічбавая манета ўяўляе сабой унікальны крыптаграфічны (матэматычны) код, які не можа выкарыстоўвацца двойчы.

Сёння кожныя 10 хвілін з'яўляецца прыкладна 25 біткойнаў, агульная колькасць якіх дасягне, як чакаецца, 21 мільёна ў 2140 годзе. Адзначым, што праграма выпуску пабудавана такім чынам, пры якім 21 мільён адзінак — канчатковая, максімальная колькасць, гэта значыць, што немагчыма паскорыць эмісію, запусціць віртуальны «друкарскі станок» і зрабіць хоць на 1 біткойн больш. Зрэшты, спецыялісты сцвярджаюць, што нават такой параўнальна невялікай колькасці манет цалкам дастаткова для паўсядзённых разлікаў, таму што 1 біткойн дзеліцца на 100 000 000 частак, якія называюцца «сатошы» — у гонар стваральніка сістэмы. Часам выкарыстоўваюцца паняцці «мілібіткойн» (mBTC, адна тысячная) і «мікрабіткойн» (uBTC, адна мільённая).

### Перавагі і недахопы

Біткойн — лічбавая валюта, якая выкарыстоўвае тэхналогію P2P, што ахоплівае ўсе функцыі, ад выпуску валюты і апрацоўкі транзакцый да верыфікацыі, якія выконваюцца калектыўна па сеціве і даступныя абсалютна любому інтэрнэт-карыстальніку.

Сістэма гарантуе адсутнасць кантролю за сеткай (а гэта значыць, нельга замарозіць які-небудзь рахунак, заблакаваць або адмяніць плацеж) і выдатную абарону лічбавых грошай. На гэты момант прадукцыйнасць вылічальнай сеткі «Біткойн» перавышае агульную вылічальную магутнасць усіх суперкамп'ютараў у свеце больш як у 8 разоў! Працей кажучы, для таго каб узяць сістэму хоць бы пад частковы кантроль, неабходныя сапраўды велізарныя грашовыя і праграмныя рэсурсы.

Яшчэ адна асаблівасць сеткі «Біткойн» — празрыстасць разлікаў. Тэарэтычна гісторыю любой аплаты можна прасачыць да моманту генерацыі манет. Ведаючы толькі адрас «Біткойн», можна ў любы час даведацца ўсе транзакцыі, прынятыя гэтым адрасам або адпраўленыя з яго. Пры гэтым, зрэшты, сістэма «Біткойн» прадастаўляе ахвотным магчымасць ананімных разлікаў, для здзяйснення якіх не трэба ніякіх дакументаў ці звестак уладальніка рахунку — толькі код, складзены прыкладна з 34 лічбаў і літар лацінскага алфавіту ў розным рэгістры.

Гэтыя характарыстыкі істотна адрозніваюць біткойн ад фіятных валют, намінальная цана якіх установлена і гарантуецца дзяржавай незалежна ад кошту матэрыялу, з якога гэтыя грошы выраблены (да фіятных грошай адносіцца, напрыклад, большасць папяровых грошай у свеце, у тым ліку рублёвыя і доларавыя банкноты). Эмісія фіятных валют цэнтралізаваная і падкантрольная нацыянальным банкам; акрамя таго, грашовыя ўклады звычайна страхуюцца урадавым органам ад банкруцтва банка. Біткойн не мае такіх механізмаў падтрымкі: яго цана цалкам залежыць ад таго, колькі інвестары гатовы заплаціць за яго ў канкрэтны момант часу. Таксама, калі ўзнікнуць праблемы з абменам, то трымальнікам біткойнаў няма куды звярнуцца па дапамогу.

Галоўныя перавагі «Біткойн» (дэцэнтралізацыя і ананімнасць транзакцый) выклікалі павышаную цікавасць асоб, якія ажыццяўляюць незаконныя дзеянні, уключаючы гандаль наркотыкамі, кантрабанду і продаж зброі і г.д. Гэта, у сваю чаргу, прыцягнула ўвагу сілавых і іншых урадавых структур, уключаючы ФБР і Дэпартамент нацыянальнай бяспекі ЗША. Так, у сакавіку 2013 года Служба па барацьбе з фінансавымі злачынствамі кваліфікавала выпуск і абмен віртуальных валют як від камерцыйнай дзейнасці па фінансавых паслугах, прыводзячы яго ў рамкі ўрадавага рэгулявання, а ўжо ў маі 2013-га Дэпартамент нацыянальнай бяспекі замарозіў рахунак Mt. Gox — найбуйнейшай біржы «Біткойн» — у банку Wells Fargo, сцвярджаючы, што ўладальнікі біржы парушылі закон па супрацьдзеянні адмыванню грошай.

### Альтэрнатыўныя валюты

Нягледзячы на згаданыя праблемы, поспех «Біткойн» і ўзрослая папулярнасць з моманту запуску прывялі да з'яўлення мноства кампаній-паслядоўнікаў, якія распрацавалі некалькі тысяч (!) альтэрнатыўных крыптавалют. Вось толькі некалькі найбольш распаўсюджаных:

— лайткойн — заснаваная ў кастрычніку 2011 года ў якасці «манеты, якая была б серабром, калі біткойн лічыць золатам», як заявіў яе заснавальнік Чарльз Лі. У адрозненне ад магутных камп'ютараў, якія патрабуюцца для работы з біткойнамі, «лайткойны» могуць апрацоўвацца звычайным настольным ПК. Максімальны ліміт лайткойнаў складае 84 мільёны, у чатыры разы перавышаючы ліміт біткойнаў, а час апрацоўкі транзакцыі роўны прыблізна 2,5 хвіліны, што ў чатыры разы менш, чым у «Біткойн»;

— рыплі — валюта, якая была выпушчаная кампаніяй OpenCoin, заснаванай прадпрымальнікам Крысам Ларсенам у 2012 годзе. Падобна «Біткойн», «Рыплі» з'яўляецца адначасова і валютай, і сістэмай аплаты. Кампанент валюты XRP мае матэматычную аснову, падобна біткойну, а механізм аплаты дазваляе перасоўванне фондаў у любой валюце іншаму карыстальніку па сетцы «Рыплі» за долі секунды;

— «МінтЧып» — у адрозненне ад большасці крыптавалют, створаны фактычна ўрадавай установай, а менавіта Каралеўскім канадскім манетным дваром. «МінтЧып» — гэта смарт-картка, якая захоўвае электронную каштоўнасць і можа надзейна яе перадаць ад аднаго трымальніка іншаму. Падобна «Біткойн», «МінтЧып» не мае патрэбы ў асабістай ідэнтыфікацыі. Аднак, у адрозненне ад «Біткойн», яна падтрымана фізічнай валютай — канадскім доларам.

### Перспектывы

Трымальнікі лічбавых грошай ва ўсім свеце задаюцца пытаннем: ці змогуць гэтая і іншыя крыптавалюты ў канчатковым рахунку выцесніць звычайныя грошы і стаць такімі ж распаўсюджанымі, як долар ці еўра? Ці крыптавалюты — толькі мода лічбавай эпохі, якая рана ці позна пройдзе?




**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 19 апреля 2016 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить объект), будет засчитан в счет окончательной стоимости объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить объект), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить объект) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере четырех процентов от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения аукциона.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки»,
г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by
Продавец: ОАО «Коминтерн», г. Гомель, ул. Интернациональная, 5. ☎ 8 (0232) 75-65-94; 8 (029) 192-37-18 •**

■ Каб памяталі

# ВАЙНА Васіля Кацюшына

## Магілёўскі гісторык знайшоў новыя звесткі з біяграфіі абаронцы горада



Васіль КАЦЮШЫН у маі 1941 года.

**Некалькі гадоў таму магілёўскі гісторык, падпалкоўнік у адстаўцы Міхаіл Рыськоў наткнуўся ў архіве грамадскіх аб'яднанняў (былога архіва абкама партыі) на ўспаміны ўдзельніка абароны Магілёва Васіля Кацюшына. Таго самага, які ў 1941-м быў начальнікам аператыўнага аддзялення штаба 172-й стралковай дывізіі і камандаваў зводным палком апалчэнцаў. У склад гэтага палка ўваходзіў і легендарны батальён міліцыі пад камандаваннем капітана Уладзімірава, які сем дзён мужна стрымліваў на подступах да Магілёва варожую сілу, якая перавышала іх у некалькі разоў, і амаль цалкам загінуў.**

### Яго полк адступіў апошнім

— Поўнай біяграфіі палкоўніка Кацюшына (у 1941-м ён быў яшчэ маёрам), на жаль, няма, — кажа гісторык. — У абласным краязнаўчым музеі захоўваецца некалькі фота і передрукаваныя на машынцы 45 старонак вось гэтых успамінаў. У 1970-я гады яны часткова ўвайшлі ў кнігу «Салдатамі былі ўсе». Але тут, у рукапісе, больш жывых, кранальных фактаў.

Кацюшын згадвае, як агульнае гора цесна аб'яднала салдат, апалчэнцаў і жыхароў горада. Адна жанчына разам з дачкой Асяй выратавалі параненага камандзіра. «Пасля бою я наведаў яго, — апісвае камандзір той эпізод. — Хлопец усміхаўся і, шчасліва пазіраючы на Асю, прызнаўся, што калі вайна скончыцца, яны абавязкова пажэняцца». Як склаўся лёс маладых людзей, Кацюшын не ведаў, але спадзяваўся, што яны абое выжылі ў той страшнай мясарубцы. Вайна не літавала ні людзей, ні іх мары.

Рэшткі свайго палка Кацюшын выводзіў з абложанага горада ў ноч з 27 на 28 ліпеня. «Раніцай 26 ліпеня была цалкам страчана сувязь з палком Куцепава, ваенкаматам, падраздзяленнямі НКУС і камандным пунктам камдыва, — сведчыць ён. — Ноч на 27 ліпеня прайшла вельмі трывожна. Немцы атакавалі нашы барыкады каля завода «Адраджэнне». Праз недахоп патронаў і снарадаў была аддадзена каманда не страляць, а знішчаць немцаў толькі ўрукапашную. Памятаю выпадак, калі з дзота на чыгуначным пераездзе тры стралкі на працягу дня «паклалі» некалькі дзясяткаў немцаў. Тыя ніяк не маглі сцяміць, адкуль вядзецца агонь».

Ад захопленага ў палон немца камандзір даведаўся, што 28 ліпеня фашысты плануюць дабіць полк, а ўвесь камандны склад павесіць каля Дома Саветаў. Аперацыя па вывадзе апошніх 350 чалавек з абложанага немцамі горада ўдалася. Пад покрывам ночы і шуму бою, пад водбліскі палаючых будынкаў людзі прашмыгнулі перад самым носам ворага. Але дайсці да сваіх атрымалася ў нямногіх. Амаль 200 кіламетраў пешшу без патронаў і ежы, водныя перашкоды на шляху сталі вельмі вялікім выпрабаваннем для знясіленых баямі людзей.

### Рукапісы не гараць

«Кожны, хто будзе чытаць гэтыя ўспаміны, зразумее, што 172-я Сталінагорская стралковая дывізія шмат што зрабіла для разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — спадзяваўся Кацюшын. — Дывізія на працягу трох тыдняў стрымлівала стальную моц брані наступаючых немцаў і гэтым дапамагла нашым войскам весці цяжкія баі за Смаленск».

У сваіх успамінах ён абяцаў напісаць кнігу пра подзвігі звычайных магіляўчан. У яго памяці такіх прыкладаў захавалася шмат. Але на свет кніга так і не з'явілася. У 1954 годзе, праз чатыры гады пасля таго, як былі напісаны гэтыя ўспаміны, палкоўніка Васіля Кацюшына не стала.



Уся інфармацыя пра героя змяшчаецца ў абласным краязнаўчым музеі ў танюсенькай папцы.

### Ордэн за абарону Магілёва

Падчас пошукаў Міхаіл Рыськоў даведаўся, што лёс камандзіра цесна звязаны з Магілёвам. У 1920 годзе Васіль Кацюшын скончыў у Магілёве пяхотныя курсы чырвоных камандзіраў. У 1941-м ён абараняў гэты горад, а ў 1944-м вызваляў Магілёўшчыну ад ворага. І нават пасля вайны яго быццам бы цягнула сюды магнітам. «Я быў вельмі ўражаны, калі даведаўся, што Кацюшын працаваў пасля вайны ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, — расказвае Міхаіл Рыськоў. — Праўда, нічога новага, акрамя таго, што палкоўнік узначальваў там ваенную кафедру з 1 ліпеня 1947 года па 13 кастрычніка 1953-га, мне не паведамілі».

Крыху больш інфармацыі знайшлося ў абласным краязнаўчым музеі. У невялікай папцы захоўваецца выразка з газеты «За камуністычную працу», дзе заслужаны настаўнік Літоўскай ССР П. Фралоў згадвае пра Кацюшына. Ён расказвае, што ў іх школьным музеі баявой славы захоўваецца інфармацыя пра тое, як камандзір вызначыўся пры абароне Магілёва. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 жніўня 1941 года ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. А на тэрыторыі Літвы Кацюшын змагаўся ў 1944 годзе ў якасці камандзіра 157-й стралковай дывізіі. Рака Нёман была апошняй сур'ёзнай перашкодай на шляху да Усходняй Прусіі, і савецкім салдатам трэба было любой цаной узяць гэты рубеж. Дывізія мужна змагалася і заслужыла ганаровае права называцца «Нёманскай», а камдыў атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга. Яшчэ адзін такі ж ордэн яму ўручалі за паспяховы прарыў праз мяжу ва Усходнюю Прусію. Неўзабаве Кацюшын быў прызначаны камандзірам 173-й стралковай Аршанскай Чырванасцяжнай дывізіі, якая яскрава праявіла сябе ў баях на тэрыторыі сучаснага Баграціёнаўскага раёна Калінінградскай вобласці. За свае баявыя подзвігі палкоўнік Кацюшын быў узнагароджаны пяццю ордэнамі.

Пасля працы ў Горках і звальнення ў адстаўку сляды палкоўніка абрываліся. Міхаіл Рыськоў адшукаў інфармацыю пра тое, што ён пераехаў ва Украіну да сына Радзія і апошні год жыцця правёў у горадзе Шостка Сумской вобласці. Там ён быў і пахаваны ў 1954 годзе.

— Па маім запыце з Сумскага ваенкамата Украіны выслалі копію асабістай справы палкоўніка Кацюшына, складзеную Міністэрствам абароны СССР. І там гаворыцца: вывеў рэшткі 172-й стралковай дывізіі з акружэння з-пад Магілёва ў колькасці 350 чалавек з поўным узбраеннем ў раёне горада Пачэп Бранскай вобласці 5 верасня 1941 года, — кажа Міхаіл Рыськоў. — Гэта сапраўды вялікі подзвіг. Яго полк апошнім пакінуў захоплены ворагам горад. Мала хто дайшоў да сваіх, але зброю і дакументы захавалі. І тое, што ў Магілёве дагэтуль няма ні вуліцы ў гонар гэтага камандзіра, ні мемарыяльнай дошкі, лічу, несправядліва. Мы павінны памятаць пра сваіх герояў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

**Фота з фондаў абласнога краязнаўчага музея імя Е. Раманава**

# Толькі мастацтва, толькі праца

## Правілы жыцця Барыса Аракчэева



Аксана АРАКЧЭЕВА падчас адкрыцця сумеснай з бацькам выстаўкі «Плывуць леты, нібы рэкі...».

**Сёлета мы адзначаем 90-годдзе з дня нараджэння Барыса Аракчэева, выдатнага жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі і ўладальніка ордэна Францыска Скарыны. Спадчынай мастака апякуецца яго малодшая дачка Аксана, таксама мастачка, графік. І па традыцыі штогод, акурат да дня нараджэння бацькі, яна ладзіць іх супольны вернісаж. Так, да 26 красавіка ў музеі Янкі Купалы працуе выстаўка Барыса і Аксаны Аракчэевых «Плывуць леты, нібы рэкі...». Карэспандэнт «Звязды» завітала ў майстэрню Аксаны Барысаўны, дзе мы пагутарылі пра лёс творчай спадчыны Барыса Аракчэева, прыгадалі адметныя рысы асобы мастака і раскрылі некаторыя сакрэты гэтай незвычайнай творчай дынастыі.**

### МАЙСТЭРНЯ І АТМАСФЕРА

Сёння Аксана Аракчэева працуе ў той жа майстэрні, дзе шмат гадоў правёў і яе бацька. Лёс склаўся так, што мастак атрымаў гэтае памяшканне акурат у той жа год, калі нарадзілася самая малодшая дачка, Аксана. Гэта было двайное шчасце для сям'і.

— Спачатку ён працаваў яшчэ з двума сябрамі-мастакамі, а ўжо ў 1970 годзе ад Саюза мастакоў усе атрымалі свае майстэрні, а тата застаўся тут, — дзеліцца ўспамінамі Аксана Барысаўна. — Так атрымалася, што ўсё наша з сёстрамі дзяцінства — у сям'і тры дачкі, і ўсе мастачкі — прайшло тут. Калі вучыліся, забягалі да таты то па фарбы, то па паперу ці проста параіцца. Рыхтавалі хатнія творчыя заданні. Нашы дзеці таксама тут працавалі. Яны амаль усе мастакі, толькі мой сын вырашыў стаць музыкантам.

Цікава, што цягам дваццаці гадоў тата з дачкой працавалі разам у адной майстэрні. Кожны тут меў сваё месца, свой закуток.

— Некаторыя мастакі кажуць, што не могуць працаваць побач з іншымі, бо ўвесь час узнікаюць сваркі, але мы з татам сябравалі і ніколі не сварыліся, — усміхаецца мастачка. — Праз тоненькую сценку я чула, як тата маляваў, шоргаў пэндзлем па палатне. Так утульна было, як у дзяцінстве. Ужо тры гады прайшло, як тата пайшоў у лепшы свет. Я прыходжу сюды і адчуваю, як яго не хапае, але здаецца, што ён зараз прыйдзе. Я яго чакаю. Таму тут усё засталося так, як было пры ім.

### БАЦЬКА І НАСТАЎНІК

У першай палове дня Барыс Аракчэеў выкладаў у Тэатральна-мастацкім інстытуце (сёння Акадэмія мастацтваў), потым да ночы працаваў у майстэрні. А якім настаўнікам ён быў?

— Гэта быў вельмі добры чалавек, вельмі далікатны. Калі хацеў нешта параіць, заўсёды прасіў прабачэння, — расказвае Аксана. — Мне ніякіх заўваг па творах не рабіў, толькі раіў, калі сама пыталася. Але часцей я камандавала, і тата пагаджаўся з маімі прапановамі. Бацька — мой першы настаўнік, але не ў тым, як і што маляваць: гэта рабілі выкладчыкі ў вучылішчы і інстытуце. Ён жа быў выдатным прыкладам. Заўсёды ў працы, стаpанны і апантаны творчасцю. Ён лічыў, што праца — гэта самае галоўнае. У таты часта пыталіся, калі яго наведвае муза, натхненне? Ён адказваў: натхненне недзе тут, ты працуй, тады яно падкажа. Калі ж будзеш проста чакаць — нічога не атрымаецца. Ён быў вельмі сціплы чалавек, ніякія пасады і званні яго не хвалявалі. Толькі мастацтва, толькі праца. Маляваў на ўсім, што траплялася пад руку, нават дзверцах ад кухонных шафак. Да сваіх работ ён ставіўся не вельмі пільна, але маляваннем быў проста апантаны.

Магчыма, гэты яркі прыклад натхніў і ўсіх дачок Барыса Уладзіміравіча таксама стаць працавітымі мастакамі. Самая старэйшая дачка, Алена, выкладае ў мастацкім каледжы імя Глебава, а Марына, сярэдняя, — у Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў.

— Я лічу, што Алена — самая таленавітая з нас. Яна цудоўная партрэтыстка. Але цяпер прысвяціла сябе выхаванню сына: ён паступіў у Акадэмію мастацтваў, сястра мае выдатны настаўніцкі талент, — дзеліцца Аксана. — Дарэчы, Алена спачатку вучылася ў музычнай школе і збіралася паступаць у кансерваторыю. Але, гледзячы на нас, нашу апантанасць маляваннем, таксама вырашыла стаць мастачкай. Цэлы год сама сабе ставіла нацюрморты, цягала нашы фарбы, працавала. Усё ж такі стала мастаком.



Барыс АРАКЧЭЕЎ. «Спакой. Крывічы». 1968 г. Кардон, алей.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

### МУЗА І ПАДТРЫМКА

Калі пытаюся пра ролю маці Аксаны і жонкі Барыса Уладзіміравіча ў яго жыцці і творчасці, мастачка адразу ж паказвае партрэт на сцяне:

— Гэта партрэт нашай мамы, Галіны Ягораўны, зроблены татам у 1956 годзе, калі яны толькі пажаніліся, — тлумачыць спадарыня Аксана. — Мама родам з маленькай беларускай вёсачкі Гара, што на Чашніччыне. Яна распавядала, што калі была маленькая, то мела мару жыць у горадзе, у кватэры, дзе ўсе сцены былі б у карцінах. Так і атрымалася. Мама вельмі любіла вучыцца, вучылася ў Маскве, працавала ў Оперным тэатры загадчыцай касцюмернага цэха. Але ў 6 гадоў я цяжка захварэла, і мама, каб больш часу са мной праводзіць, стала настаўніцай працы.

Роля жонкі ў творчасці Барыса Аракчэева, хоць і не такая заўважная звонку, але вельмі значная. Яна прысвяціла сябе сям'і, была і натхненнем для мужа, і выдатнай гаспадыняй. Шмат абавязкаў выконвала, каб мастак мог спакойна працаваць.

— Падтрымка жонкі, сям'і вельмі важная для творцы, — дадае мастачка. — Я ведаю шмат прыкладаў, калі адсутнасць разумення з боку блізкіх вельмі негатыўна адбівалася на творчым лёсе мастакоў.

### ГАЛЕРЭЯ І ПАМЯЦЬ

Сёння Аксана шмат сіл і працы ўкладае ў тое, каб памяць пра яе бацьку жыла. Так, летась у Крупках адкрыта галерэя імя Барыса Аракчэева. Пакуль гэта невялічкае памяшканне ў мясцовым Палацы культуры, але сям'я спадзяецца, што з цягам часу пад галерэю атрымае новы будынак.

— У нашай майстэрні — вялікая скарбніца татавых работ. Але нельга сцвярджаць, што іх няма ў музеях краіны, — кажа Аксана. — Карціны таты захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, Музеі гісторыі Мінска. Ва ўсіх музеях і галерэях Беларусі татавы работы таксама ёсць. Ён шмат працаваў і пакінуў сапраўды вялікую спадчыну.

Таму кожны раз, плануючы чарговую выстаўку работ Барыса Аракчэева, яго дачка рыхтуе для паказу новыя і новыя работы бацькі, каб упершыню прадставіць іх публіцы. Вось і на выстаўцы, што цяпер праходзіць у Купалаўскім музеі, можна пабачыць рарытэты. Гэта перадусім чарцяжы мастака.

— У той час, калі тата заканчваў мастацкае вучылішча, выпускнікі атрымлівалі дыплом па дзвюх спецыяльнасцях: «чарчэнне» і «жывапіснае палатно», — тлумачыць Аксана. — Фарміраванне таты як мастака пачалося менавіта з чарцяжа. Падчас службы ў войску ён пісаў плакаты, чарціў карты. І ў сямейным архіве захаваліся яго работы 1952 года. Гэта проста ідэальныя чарцяжы! Час ад часу я вымаю з запаснікаў невядомыя работы таты, аздабляю іх рамамі і выстаўляю. Іх вельмі-вельмі шмат, таму аматараў творчасці Барыса Аракчэева яшчэ чакае мноства адкрыццяў.

У юбілейны год Барыса Аракчэева яго сям'я ладзіць многа выставачных праектаў. Ужо прайшла выстаўка ў Магілёве, а ў Крупках гэтымі днямі дэманструюцца пленэрныя работы Барыса Аракчэева і яго вучняў «Калі прырода — твой настаўнік». Наперадзе яшчэ шмат праектаў: гэта і выстаўка работ яраслаўскага цыкла, калі Барыс Аракчэеў быў у Яраслаўлі падчас святкавання 100-годдзя Максіма Багдановіча, і праект «Мінск Барыса Аракчэева», што рыхтуецца ў Музеі горада Мінска.

Але ў планах Аксаны — яшчэ адна задумка, кніжная. Яна дзеліцца:

— У нас з пісьменніцай Аленай Масла ёсць ідэя пад адной вокладкай сабраць успаміны татавых сяброў, тых, хто яго ведаў, змясціць у гэтым выданні архіўныя фотаздымкі і выявы. Мы збіраем матэрыялы па музеях, па тых мясцінах, дзе тата бываў на пленэрах, шукаем навуковыя працы па яго настаўніцка-педагагічнай дзейнасці. Думаецца, атрымаецца проста незвычайнае і цікавае выданне, дзе будуць прадстаўлены ўсе перыяды творчасці мастака.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Солигорский райагросервис» (продавец)**

**проводит открытый аукцион по продаже**

**комбайна зерноуборочного ДОН – 1500 Б,**

**2006 г. выпуска, заводской № 094682, инвентарный № 4120, регистрационный номер БШ 4061.**

**Начальная цена с НДС – 143 445 960 бел. руб.**
**Задаток 10% от начальной цены (14 344 000 бел. руб.).**

**Имущество расположено по адресу:**
**Минская область, Солигорский район, г.п. Красная Слобода.**

**Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.05.2016** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.05.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

АБСОЛЮТБАНК

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 1 апреля 2016 г.**

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 87 848 | 53 660 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 44 169 | 37 740 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 119 364 | 178 314 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 97 275 | 3 205 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 552 732 | 250 878 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 5 955 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 | 1 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 64 348 | 46 257 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 28 916 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 24 986 | 16 637 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 1 019 639 | 592 647 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 3 | 3 165 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 91 843 | 17 917 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 408 330 | 136 292 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 35 308 | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 9 608 | 10 859 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 545 092 | 168 233 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 373 306 | 373 306 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 6 478 | - |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 29 870 | 28 490 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 64 893 | 22 618 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 474 547 | 424 414 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 1 019 639 | 592 647 |

**ОТЧЕТ**
**о прибылях и убытках**
**на 1 апреля 2016 г.**

Наименование банка: ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 38 733 | 37 065 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 13 013 | 4 745 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 25 720 | 32 320 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 245 | 4 185 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 761 | 384 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 484 | 3 801 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 13 653 | 12 785 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 795 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2 860 | 4 662 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 702 | 2 075 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 27 331 | 14 879 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 532 | 156 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 10 836 | 32 079 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 3 068 | 8 133 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 7 768 | 23 946 |

Руководитель В.И.Вашкевич

Главный бухгалтер О.С.Турбина

Дата подписания «11» апреля 2016 г.

**Отчетность о деятельности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» в полном объеме размещена на сайте www.absolutbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №9 от 24.06.2015. УНП 100331707

# Падарожжа ў краіну Оз

## Як Аўстралія абараняецца ад непажаданых гасцей?



Зялёны кантынент, быццам магнітам, прыцягвае прыезджых. У Аўстраліі жыве велізарная колькасць эмігрантаў з усяго свету. Па статыстыцы, кожны чацвёрты жыхар краіны быў народжаны за яе межамі. Пакуль лідары еўрапейскіх краін думаюць, як даць рады мігранцкаму крызісу, Аўстралія прапануе ці не гатовы рэцэпт вырашэння цяжкага пытання. Вядома, максімальна цвёрдая (нават жорсткая) палітыка ў дачыненні да нелегалаў не заслужыла ўхвалення праваабаронцаў, затое засцерагла краіну ад незлічоных лодак з няпрошанымі гасцямі. Якія ж асаблівасці нацыянальнага прыёму мігрантаў на Зялёным кантыненце?

### МЕСЦА ДЛЯ КАТАРЖНІКАЎ

Тэрмін «Аўстралія» ўтварыўся ад лацінскага «australis» (паўднёвы). Пачаткам гісторыі гэтых мясцін прынята лічыць перасяленне абарыгенаў на кантынент з Паўднёва-Усходняй Азіі больш як 50 тысяч гадоў таму. Легенды пра Невядомую паўднёвую зямлю (лац. — Terra Australis Incognita) узыходзяць да часоў Рымскай імперыі, а пасля былі звычайнай з'явай у сярэднявечнай геаграфіі, нягледзячы на тое, што не грунтаваліся на якіх-небудзь канкрэтных ведах пра сам кантынент. Для пазначэння прыметніка «аўстралійскі» тутэйшыя жыхары выкарыстоўваюць слова Aussie. А ўласна дзяржаву называюць Оз. Пагадзіцеся, калі ўзгадаць месцазнаходжанне і ўсе дзівосы Зялёнага кантынента, атрымліваецца вельмі сімвалічна

Адкрыццё Аўстраліі адбылося больш за чатыры стагоддзі таму — у 1606 годзе, калі Вілем Янсан назваў яго Новай Галандыяй і абвясціў уладаннем Нідэрландаў (дарэчы, галандцамі гэтая тэрыторыя ніколі і не асвойвалася). Цікава, што ў гэты час тут жыло каля мільёна абарыгенаў, якія падзяляліся на 300 плямёнаў і размаўлялі на 250 мовах і 700 дыялектах! У 1770-м на ўсходняй частцы Зялёнага кантынента высадзіўся легендарны капітан Джэймс Кук і «замацаваў» яго за Вялікабрытаніяй. Першая брытанская калонія — Новы Паўднёвы Уэльс — была заснавана 26 студзеня 1788 года, калі Артур Філіп прывёў Першы флот у Порт-Джэксан (цяперашні Сідней). Гэты дзень стаў пасля нацыянальным святам — Днём Аўстраліі. Новае паселішча было вырашана пераўтварыць у... выпраўленчую калонію, і цягам амаль стагоддзя сюды адпраўлялі катаржнікаў.

На пачатку XIX стагоддзя вайскоўцы і колішнія зняволеныя паступова выціскалі абарыгенаў углыб кантынента. Большасць насельніцтва Аўстраліі — нашчадкі імігрантаў XIX і XX стагоддзяў, якія пераважна прыбылі з Вялікабрытаніі і Ірландыі. Самаахвотная іміграцыя з Англіі прыняла значныя памеры толькі ў 1820-я, калі на Зялёным кантыненце пачала хутка развівацца авечкагадоўля. А калі ў штатах Новы Паўднёвы Уэльс і Вікторыя знайшлі золата, сюды пацёк проста паток шукальнікаў шчасця. За 10 гадоў (1851—1861) насельніцтва павялічылася амаль утрая, перавысіўшы 1 млн чалавек.



### МАРКЕР ІНШАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Адметная статыстыка: за перыяд пасля Другой сусветнай вайны і да цяперашняга часу насельніцтва Аўстраліі павялічылася больш як удвая (пасля Першай сусветнай вайны — у 4 разы). Такія дэмаграфічныя зрухі адбыліся дзякуючы ажыццяўленню амбіцыйнай праграмы стымулявання іміграцыі. У пачатку 2000-х 27,4% насельніцтва Аўстраліі складалі людзі, якія нарадзіліся за мяжой. Самымі вялікімі групамі сярод іх з'яўляліся брытанцы і ірландцы, новазеландцы, італьянцы, грэкі, галандцы, немцы, югаславы, в'етнамцы, а таксама кітайцы.

Доўгі час улады краіны трымалі курс на стварэнне «Аўстраліі толькі для белых». Прыняты ў 1901 годзе закон блакіраваў заезд выхадцам з нееўрапейскіх краін, быў уведзены абавязковы для прыезджых экзамен на веданне адной з моў Старога Свету (па выбары чыноўніка іміграцыйнага ведамства). У 1958 годзе закон быў скасаваны, а іміграцыйнае заканадаўства лібералізавана. У краіну хлынуў паток выхадцаў з розных азіяцкіх краін. Па словах навуковага супрацоўніка аддзела Паўднёва-Ціхаакіянскіх даследаванняў Інстытута ўсходазнаўства РАН Наталлі Скарабагатых, разам са зменай этнічна-рэлігійнага складу аўстралійскага грамадства адбылася і змена культурнай парадыгмы. У выніку да канца 1990-х гадоў гарады краіны практычна падзяліліся на нацыянальныя кварталы, падкрэслена аформленыя ў этнаканфесійным духу. Моладзь нечакана пачала падкрэсліваць сваю рэлігію як нейкі маркер прыналежнасці да іншай цывілізацыі. І аўстралійскія ўлады ўсур'ёз задумаліся над тым, якім чынам змяніць сітуацыю.

### АД «ЦІХААКІЯНСКАГА РАШЭННЯ»...

Як вядома, Аўстралія з'яўляецца адной з найбольш развітых краін (трынаццатая па памеры эканоміка ў свеце) і мае шостае месца ў свеце па ВУП у разліку на душу насельніцтва. Апошні паказчык тут вышэйшы, чым у Вялікабрытаніі, Германіі і Францыі па парытэце пакупніцкай здольнасці. Краіна з'яўляецца адным з лідараў па індэксе чалавечага развіцця і якасці жыцця.

Па звестках The New York Times, у Аўстралію спрабуюць трапіць галоўным чынам жыхары Шры-Ланкі, Ірака, Афганістана, Судана, Эрытрэі і Інданезіі. Бежанцам даводзіцца перададольваць адлегласць у некалькі тысяч кіламетраў па Індыйскім акіяне.

Не жадаючы прымаць няпрошаных гасцей на сваёй зямлі, Канбера яшчэ ў 2001 годзе склала дагаворы з аднымі з найбяднейшых суседніх краін: Науру і Папуа — Новай Гвінеяй. Па ўмовах пагадненняў на тэрыторыі астраўной дзяржавы і на гвінейскім востраве Манус стварaліся спецыяльныя цэнтры прыёму бежанцаў, куды сіламі аўстралійскага ВМФ перавозіліся ўсе ахвотнікі атрымаць прыстанішча і дзе іх справы разглядаліся аўстралійскімі дзяржаўнымі службоўцамі. План атрымаў назву «Ціхаакіянскае рашэнне». Здавалася б, усім бакам выгадны такі расклад: Аўстралія перакрывала паток нелегалаў, а бедныя краіны атрымлівалі дадатковае фінансаванне. Дэкларавалася, што гэта робіцца для бяспекі саміх бежанцаў, якія часта гінулі пры спробе дабрацца да Зялёнага кантынента.

Тады Канбера сапраўды дабілася таго, чаго хацела: з верасня 2001 года па пачатак 2008-га 1637 нелегалаў былі змешчаны ў спеццэнтры, і паток лодак з мігрантамі практычна вычарпаўся. І ўсё ж грошы на ўтрыманне цэнтраў выдзяляць даводзілася. Таму ўрад лейбарыстаў у 2008-м урачыста адмовіўся ад «Ціхаакіянскага рашэння». Аднак вымушаны быў да яго вярнуцца літаральна праз некалькі гадоў, калі хваля нелегалаў, якія даведаліся пра паслабленні, зноў накіравалася да аўстралійскіх берагоў.

### ...ДА «СУВЕРЭННЫХ МЕЖАЎ»

«З гэтага часу кожны шукальнік прыстанішча, які прыбудзе ў Аўстралію на лодцы, не атрымае ніводнага шанцу застацца ў нашай краіне. Калі ён сапраўды акажацца вымушаным перасяленцам, яму дазволяць пасяліцца ў Папуа — Новай Гвінеі», — так у 2013 годзе тагачасныя прэм'ер-міністры Аўстраліі і Папуа — Новай Гвінеі анансавалі аднаўленне палітыкі, якая павінна была пазбавіць Зялёны кантынент ад наплыву няпрошаных гасцей. Новы план атрымаў назву «Суверэнныя межы». На гэты раз гайкі закруцілі яшчэ мацней, і бежанцаў пазбавілі нават прывіднага шанцу пасяліцца ў краіне Оз. Закрытыя раней цэнтры зноў адкрыліся, а грошы з аўстралійскай казны пайшлі ў бюджэты суседніх краін. Таксама было складзена пагадненне пра перасяленне бежанцаў на тэрыторыю Камбоджы.

Гэтым разам аўстралійскі ўрад падышоў да «канчатковага вырашэння мігранцкага пытання» з сапраўды стратэгічным размахам. Дайшло да таго, што выкупляліся старыя лодкі, каб уладальнікі не прадавалі іх кантрабандыстам. Калі лодку з мігрантамі выяўлялі ў тэрытарыяльных водах Аўстраліі, караблі ВМФ бралі яе на буксір і дастаўлялі назад да інданезійскіх берагоў — часта пры гэтым парушаючы нацыянальны суверэнітэт гэтай краіны. Маракоў нават вызвалілі ад фармальнага абавязку праяўляць «належную абачлівасць» пры транспартаванні бежанцаў назад. Калі ж вымушаным перасяленцам усё ж удавалася дабрацца да берагоў Зялёнага кантынента, іх садзілі ў надзіманыя лодкі і адпраўлялі ў бок Інданезіі ці Шры-Ланкі.



Па звестках памежнай службы ў пачатку 2016 года ў цэнтрах для мігрантаў знаходзіліся 1807 чалавек. «Сярэдні тэрмін утрымання людзей пад вартай складае 457 дзён», — спакойна адзначаецца ў справаздачы. Пры гэтым агульная колькасць нелегалаў няўхільна (і імкліва) змяншаецца: у студзені 2013 года іх было амаль у сем разоў больш.

Летась Аўстралія пагадзілася прыняць у сябе 12 тысяч бежанцаў, якія ратуюцца ад канфлікту ў Сірыі. Як паведамляе агенцтва Reuters, сірыйскіх бежанцаў будуць узмоцнена кантраляваць нават пасля таго, як яны атрымаюць аўстралійскае грамадзянства.Такім чынам улады спадзяюцца не дапусціць «экстрэмісцкай інфільтрацыі» — пранікнення на тэрыторыю краіны членаў тэрарыстычных груповак.

— Мы прымем пакет рэформаў, які спросціць парадак атрымання віз у Аўстралію, але пры гэтым дазволіць больш старанна кантраляваць тых, хто мае намер атрымаць пасведчанне на права жыхарства і грамадзянства, — заўважыў міністр па міграцыі Піцер Датан.

Крытыка аўстралійскай палітыкі ў дачыненні да нелегалаў гучыць увесь час: яе жорсткасцю незадаволены і ва ўпраўленні Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, і ў Human Rights Watch, і ў іншых гуманітарных арганізацыях. І ўсё ж і кааліцыя правых партый, і лейбарысты на гэта, здаецца, не зважаюць. Некалькі месяцаў таму Вярхоўны суд Аўстраліі пацвердзіў права ўлад трымаць нелегалаў у лагерах за межамі краіны і ўхваліў дэпартацыю 267 мігрантаў, што чакаюць адпраўкі ў Науру.

Як адзначаюць назіральнікі, такая жорсткая палітыка ў дачыненні да мігрантаў, якая раней здавалася прыладай маргіналаў, цяпер знаходзіць усё большую папулярнасць сярод еўрапейскіх палітыкаў. Праўда, маштабы праблемы, з якой сутыкнуўся Стары Свет, зусім іншыя...

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5».

## Жилой дом № 3 по генплану
## ДОЛЕВОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО НА КОММЕРЧЕСКОЙ ОСНОВЕ

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ:**

Закрытое акционерное общество «Совавто Инвест»; место нахождения: г. Минск, ул. Сурганова, дом 61, помещение 81; режим работы: с 09.00 до 17.30. Обеденный перерыв: с 13.00 до 13.30. Выходные дни: суббота и воскресенье. Общество зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 28.03.2011 за № 191445859. Застройщик не принимал участие в строительстве жилых домов и иных объектов недвижимости.

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА:**

1. Цели строительства: **возведение многоквартирного жилого дома**; этапы и сроки реализации: **возведение в один этап в срок по 13.07.2016**; получены положительные заключения государственной экспертизы от **22.03.2013 № 154-15/13** и **03.12.2015 № 1118-15/15**.

2. Сведения о месте нахождения объекта строительства и его характеристики, в том числе сведения о количестве объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров, сведения о ценах на объекты долевого строительства и условия их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке: **2-подъездный 10-этажный крупнопанельный 108-квартирный жилой дом № 3 по генплану в изделиях серии М464-М по ул. Олешева в г. Минске.**

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются следующие квартиры по указанным ниже ценам:

| Тип квартиры | Площадь по СНБ (м.кв.) | Стоимость 1 кв.м* в долларах США** | Цена объекта долевого строительства в долларах США** | Количество квартир | Номера квартир |
|---|---|---|---|---|---|
| 1к | 40,77 | 1 300 | 53 001 | 3 | 49, 16, 52 |
| 1к | 44,28 | 1 300 | 57 564 | 6 | 26, 50, 56, 33, 51, 91 |
| 1к | 41,16 | 1 300 | 53 508 | 1 | 53 |
| **ИТОГО для заключения договоров долевого строительства предлагаются** | | | | **10 квартир** | |

***Действует система скидок.***

*** Оплата производится в белорусских рублях по официальному курсу, установленному Нацбанком на дату платежа по договору.***

Цена объекта долевого строительства может быть изменена застройщиком в одностороннем порядке в случае нарушения дольщиком срока оплаты и (или) размера платежей по договору создания объекта долевого строительства вне зависимости от периода просрочки платежа и/или размера несвоевременно внесенного платежа.

3. Информация о решении местного исполнительного и распорядительного органа о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (при наличии такой информации): **в жилом доме № 3 по генплану отсутствует.**

4. Данные о правах застройщика на земельный участок, его площади: **право временного пользования в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000008001883, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Олешева, 5, площадью 2,5774 га.**

Границы земельного участка: ограничен с севера красными линиями ул. Олешева; с востока территорией существующего жилого дома ТС «Логойское» и строящегося дома ОДО «ОлКи»; с юга территорией существующей группой жилых домов ОАО «ДСТ-5»; с запада пешеходным тротуаром вдоль ул. Восточной.

Данные об элементах благоустройства: **организация подъездов, проездов и парковок; формирование сети пешеходных тротуаров и дорожек; устройство детских площадок, площадок для отдыха взрослого населения и площадки для хозяйственных нужд; озеленение территории; оборудование территории малыми архитектурными формами.**

5. Сведения о количестве в строящемся жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию жилого дома и иных объектов недвижимости: **10 квартир.**

6. Сведения о функциональном назначении нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества многоквартирного жилого дома: **нет.**

7. Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам: **межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.**

8. Сведения о предполагаемом сроке приемки в эксплуатацию строящихся жилых домов и иных объектов недвижимости: **13.07.2016.**

9. Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком (при их наличии), и порядке ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: **договор строительного генподряда от 29.03.2013 № 16/05-13, заключенный застройщиком с ОАО «МАПИД».**

Дольщики вправе ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству по согласованию с Застройщиком в установленное им время и в присутствии его уполномоченного представителя с соблюдением правил и техники безопасности. Уполномоченный представитель Застройщика: **ООО «Сильван» (г. Минск, ул. Я. Купалы, д. 17/30; тел. 8 017 222 38 32, 8 017 222 38 17). Инженерная организация: ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».**

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
11 апреля 2016 г.
Сушко С.А.

**УТВЕРЖДЕНО**
Общим собранием участников
ООО «ЗападИнвестСистемз»
11.01.2016 (Протокол № 6/н)

# ИЗМЕНЕНИЯ В РЕШЕНИЕ О ВЫПУСКЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ СЕДЬМОГО ВЫПУСКА

## Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (ООО «ЗападИнвестСистемз»)

Общество с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (далее – Эмитент) на основании Протокола заседания Общего собрания участников от 11.01.2016 № 6/н вносит следующие изменения в Решение о выпуске облигаций Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (номер государственной регистрации 5-200-02-2651, дата государственной регистрации 13.11.2015) (далее – Решение о выпуске облигаций):

1. Пункт 2 Решения о выпуске облигаций изложить в следующей редакции:

«**2. Место нахождения эмитента.**

220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 2.

Телефон/факс: 8 (017) 302-84-10.

Электронный адрес (e-mail): info@tapas.by»

2. Пункт 12 Решения о выпуске облигаций изложить в следующей редакции:

«**12. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается поручительством:

- Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» на сумму 10 000 000 000 (Десять миллиардов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 11.01.2016 №6/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 19.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 190976309.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 58 789 млн. белорусских рублей;

- Общества с ограниченной ответственностью «Белскладкомплекс-2» на сумму 494 000 000 (Четыреста девяноста четыре миллиона) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 11.01.2016 №6/н.

Место нахождения поручителя: 223050, Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, аг. Колодищи, ул.Чкалова, д. 37, пом. 6.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 691787106.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 51 683 млн. белорусских рублей.

В случае неисполнения или ненадлежащего исполнения эмитентом обязательств перед владельцами облигаций требования к поручителям предъявляются в письменной форме с приложением выписки по счету «депо», подтверждающей право собственности владельца на данные облигации и возможность их отчуждения (отсутствие ограничений, связанных с обременением облигаций обязательствами). Данное требование должно быть представлено поручителю по его месту нахождения.

Поручитель отвечает в том объеме, за который поручается.

При получении требования поручитель обязан рассмотреть его в срок, не превышающий 15 (Пятнадцать) календарных дней. При принятии положительного решения по вопросу исполнения обязательств эмитента по облигациям платеж в пользу обратившихся к поручителям владельцев облигаций осуществляется поручителем в течение 30 (Тридцати) банковских дней.

Договор о предоставлении поручительства вступает в силу с момента его подписания эмитентом и поручителем и действует в течение всего срока обращения облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока обращения облигаций.

Действие договора о предоставлении поручительства прекращается после исполнения обязательств по облигациям (в том числе досрочного погашения всего выпуска облигаций) либо по истечении трех месяцев после окончания срока обращения облигаций, если владельцы облигаций не предъявят в указанный трехмесячный срок требований о выплате денежных средств по облигациям к эмитенту или к поручителю.

В случае принятия решения о ликвидации поручителя, а также в случае, если стоимость чистых активов поручителя, рассчитываемая на первое число каждого квартала, станет меньше объема находящихся в обращении облигаций, эмитент в течение двух месяцев с момента возникновения одного из вышеперечисленного основания осуществляет полную замену обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо в части недостающей стоимости чистых активов данного поручителя или осуществляет досрочное погашение данного выпуска облигаций либо его части. В случае принятия эмитентом решения о полной замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям либо его части, эмитент вносит соответствующие изменения в Решение о выпуске облигаций и в Проспект эмиссии. Эмитент обязан зарегистрировать такие изменения в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь и в семидневный срок известить о данном факте владельцев облигаций посредством публикации соответствующей информации в периодическом печатном издании, определенном эмитентом для раскрытия информации.

Эмитент по собственной инициативе вправе принять решение о замене обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям с обязательным согласованием данного вопроса с владельцами облигаций до принятия данного решения эмитентом. Замена обеспечения осуществляется эмитентом после внесения соответствующих изменений в Решение о выпуске облигаций и в Проспект эмиссии. Эмитент обязан зарегистрировать такие изменения в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь и в семидневный срок оповестить о таких изменениях владельцев облигаций посредством публикации соответствующей информации в периодическом печатном издании, определенном эмитентом для раскрытия информации.

При несогласии владельца(ев) облигаций с заменой эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям, владелец (цы) облигаций вправе предъявить эмитенту облигации к выкупу, в течение 60 (Шестидесяти) календарных дней с момента получения письменного уведомления о замене эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям. В данном случае замена эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям осуществляется после удовлетворения требований владельцев облигаций, несогласных с заменой эмитентом обеспечения исполнения своих обязательств по облигациям. Выкуп облигаций производится в аналогичном порядке, определенном пунктом 22 настоящего Решения.».

3. Пункт 14 Решения о выпуске жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«**14. Место, время и порядок размещения облигаций.**

Проведение открытой продажи облигаций осуществляется эмитентом ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 по адресу: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17.

Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.

Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с эмитентом договор в простой письменной форме (далее – договор с эмитентом), предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

Открытая продажа облигаций осуществляется по цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи жилищных облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.».

4. Остальной текст Решения о выпуске облигаций остается без изменений.

Генеральный директор
Управляющей компании эмитента И.Я. Кривецкий

Ответственный бухгалтер Эмитента О.Э. Мышаковская

от поручителя
ООО «ТАПАС ПЛЮС»
в лице директора С.П. Ставер

от поручителя
ООО «Белскладкомплекс-2»
в лице управляющей компании
ООО «ТАПАС ИНВЕСТКАПИТАЛ»
в лице управляющего А.Г. Савицкий

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
11 апреля 2016 г.
Сушко С.А.

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием участников
ООО «ЗападИнвестСистемз»
11.01.2016 (Протокол № 6/н)

# ИЗМЕНЕНИЯ В РЕШЕНИЕ О ВЫПУСКЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ДЕВЯТОГО ВЫПУСКА

## Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (ООО «ЗападИнвестСистемз»)

Общество с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (далее – Эмитент) на основании Протокола заседания Общего собрания участников от 11.01.2016 № 6/н вносит следующие изменения в Решение о выпуске облигаций Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (номер государственной регистрации 5-200-02-2651, дата государственной регистрации 13.11.2015) (далее – Решение о выпуске облигаций):

1. Пункт 2 Решения о выпуске облигаций изложить в следующей редакции:

«**2. Место нахождения эмитента.**

220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 2.

Телефон/факс: 8 (017) 302-84-10.

Электронный адрес (e-mail): info@tapas.by»

2. Пункт 12 Решения о выпуске облигаций изложить в следующей редакции:

«**12. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается поручительствами:

1. Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» на сумму 1 639 000 000 (Один миллиард шестьсот тридцать девять миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 11.01.2016 №6/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 101484246.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 35 041 млн. белорусских рублей;

2. Общества с ограниченной ответственностью «Столичный аспект» на сумму 1 000 000 000 (Один миллиард) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 28.10.2015 №6/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 1-й этаж, офис 33.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 191606427.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.10.2015 составляет 1 093 млн. белорусских рублей.

